Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
22 ЖНІЎНЯ 2018 г. СЕРАДА № 160 (28776)



САЛІГОРСКУ 60 ГАДОЎ 7-10

ТКАЦКІ ПЛЕНЭР У НЕГЛЮБЦЫ 13



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Людміла ЛЁГКАЯ, начальнік аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі і экспертызы Міністэрства аховы здароўя:**

*«У Міністэрстве аховы здароўя Беларусі і ўпраўленнях па ахове здароўя аблвыканкамаў мы займаемся маніторынгам паведамленняў пра збор сродкаў на лячэнне і рэабілітацыю беларусаў за мяжой, у тым ліку і для таго, каб даць ацэнку таму, ці ўвесь аб'ём медыцынскай дапамогі і рэабілітацыі гэтае дзіця або дарослы чалавек атрымаў у нас. Маніторым з мэтай высвятлення, для чаго менавіта ажыццяўляецца збор грошай праз рэкламу на тэлебачанні і ў іншых СМІ».*

# СПЕЧАНА З ДУШОЙ




**Валянціна ГМІР, Наталля ХМАРУК, Галіна ШЭЛЕСТ, Раіса ШПУДЗЕЙКА і Валянціна ЛІЧЭЎСКАЯ (на фота) — жыхаркі суседніх вёсак Дзераўная і Гарадная. Іх аб'ядноўвае не толькі зямляцтва і суседства, але і праца, і ўменне зберагаць мясцовыя народныя звычаі і традыцыі. Па-першае, жанчыны з'яўляюцца сацыяльнымі работнікамі і працуюць у адной установе — у Столінскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. У кожнай з іх пад апекай па некалькі пенсіянераў старэйшага ўзросту. А па-другое, у вёсках іх ведаюць і як майстрых па выпечцы, знатных каравайніц. Вось і на нядаўнім вясковым святе жанчыны дэманстравалі сваё мастацтва — духмяныя караваі.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• Доля ААТ «ААБ Беларусбанк» на рынку жыллёвага крэдытавання складе амаль 50 %.

• **Гатоўнасць апошніх шасці пускавых комплексаў для выдачы магутнасці з БелАЭС складае больш за 70 %.**

• Хірургі нейрахірургічнага аддзялення Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі праводзяць больш за 500 нейрахірургічных аперацый у год. З іх каля 200 на пазваночніку, у тым ліку замену пазванкоў.



• **У рацэ Нішчы каля аграгарадка Клясціцы Расонскага раёна дайверы і краязнаўцы знайшлі часткі старога моста і млын.**

ISSN 1990 - 763X
18160

■ У цэнтры ўвагі

## Школьны абед: смачна, карысна, прыгожа

### Што рабіць, каб навучэнцы не замянялі здаровае харчаванне піцамі і сасіскамі?

**Якім павінна быць дзіцячае харчаванне: смачным ці карысным? А ці можна зрабіць яго адначасова і смачным, і карысным, асабліва ў школьнай сталовай? У Навукова-практычным цэнтры НАН Беларусі па харчаванні вырашылі з дапамогай анкетавання расставіць усе кропкі над «і».**



— Мы дамовіліся з Міністэрствам адукацыі, што ў анкетаванні будуць удзельнічаць амаль усе школы, — расказаў **начальнік аддзела харчавання НПЦ па харчаванні Валерый ШЫЛАЎ.** — Нас цікавіць, як ацэньваюць школьнае харчаванне самі вучні, іх бацькі і педагогі, і на падставе атрыманай інфармацыі будзем рабіць высновы.

Аўтараў анкеты, у прыватнасці, цікавіць ступень задаволенасці якасцю харчавання ў школе, складаннем меню, арганізацыяй рэжыму харчавання, санітарным станам сталовай... Запоўніць анкету можна на сайце Навукова-практычнага цэнтра НАН па харчаванні http://www.new.belproduct.com/uslugi/anketirovanie.html

СТАР. 4

## РЭВІЗІЯ ПЕРАД ЗІМОЙ

Жывіце ў бяспецы!

### Як дыхтоўна падрыхтавацца да халадоў?

**Да надыходу халадоў засталося зусім нічога. Менавіта таму канец жніўня — самы час правесці праверку патэнцыйна небяспечных месцаў з проціпажарнага пункту гледжання ва ўласным доме. Як правіла, гэта пячное абсталяванне і электрычная праводка.**

— У Мінскай вобласці па-ранейшаму ў сельскай мясцовасці, ды і часта ў раённых цэнтрах для ацяплення жылля выкарыстоўваюць печку, — кажа **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях па Мінскай вобласці Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Шмат дзе іх узрост ужо вельмі паважны.

Сіноптыкі абяцаюць, што ночы ў найбліжэйшыя дні будуць ужо халаднаватыя. Таму самы час праверыць, наколькі ж печка не прапускае куродым у жылое памяшканне. Сценкі печкі і комін трэба пабяліць, а пасля ў ёй прапаліць. Калі недзе ў корпусе з'явіліся трэшчыны — дым іх «падсвеціць», як на фотаплёнцы. Іх і трэба затынкаваць. Таксама паміж печчу і сцяной абавязкова павінна быць так званая адступка — паветраны прамежак, які будзе выконваць ролю цеплавога ізалятара для дрэва.

Паказальным з'яўляецца выпадак, які адбыўся ў Мар'інай Горцы 14 мая. На вуліцы Кірава загарэўся прыватны дом. Ратавальнікі, якія прыбылі на месца падзей, выявілі, што ўнутры драўлянай пабудовы адбываецца адкрытае гарэнне. У пакоі пасля яны знайшлі целы дзвюх жанчын. Адной з іх было 94 гады, другой — 70. Узгаранне адбылося з-за няспраўнай печкі. Пажар таксама знішчыў дах на плошчы ў 25 квадратных метраў і маёмасць унутры дома.

Не з'яўляецца выключэннем з проціпажарнай прафілактыкі і гарышча. Натуральна, што ўчастак коміна, які там праходзіць, не можа кантралявацца гаспадаром у пастаянным рэжыме. Акрамя таго, ёсць у коміне адно «слабае» месца — там, дзе ён судакранаецца з драўлянымі перакрыццямі даху.

СТАР. 4

■ Заканатворчасць

# ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ

## Узрост для наведвальнікаў казіно павялічылі да 21 года

**Гэта мера прадугледжана Указам Прэзідэнта № 305 «Аб удасканаленні прававога рэгулявання ігральнага бізнесу».**

«У Рэспубліцы Беларусь ужо быў рэалізаваны шэраг мер, якія накіраваны на сацыяльную абарону грамадзян. Гэта і механізм самаабмежавання, і абарона асоб, якія не ўсведамляюць, што ў іх ужо ёсць прывязанасць да азартных гульняў. Тым не менш яны ставяць сваіх родных у цяжкае матэрыяльнае становішча, адпаведна сваякі могуць праз судовы парадак абмежаваць такіх асоб. Шырокая дыскусія была ў грамадстве на прадмет таго, ці дастаткова 18 гадоў, каб абмежаваць асобе наведванне ігральных устаноў. Таму мы з улікам сусветнага вопыту глыбока вывучылі гэтае пытанне, і кіраўнік дзяржавы пагадзіўся з прапановай, каб павялічыць узроставы парог», — паведаміў **Уладзімір МУКВІЧ, намеснік міністра па падатках і зборах,** падчас сустрэчы ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

Новаўвядзенні прадугледжваюць і іншыя меры кантролю. Дакладна вызначаны месцы, дзе арганізатары гульняў павінны ўстанавіць відэакамеры, — пры ўваходзе, у залах, каля кас, дзе выплачваюцца выйгрышы.

Прынцыпова прагрэсіўны характар дакумента ў тым, што ўпершыню прапісаны механізмы легалізацыі віртуальных казіно. У Рэспубліцы Беларусь гэта дзейнасць была забаронена. Па словах спецыялістаў, росту колькасці анлайн-казіно не будзе, таму што ўмовы рэгістрацыі дастаткова жорсткія. Асноўнае патрабаванне — устаноўка спецыяльных камп'ютарных касавых сістэм, з дапамогай якіх ажыццяўляецца дзяржаўны кантроль гэтага бізнесу. Неабходны залогавы фонд для арганізатараў гульняў, які б забяспечваў выплаты. Яшчэ адзін момант — надзейная сістэма абароны персанальнай інфармацыі аматараў азартных гульняў.

Указ змяшчае і меры лібералізацыі для арганізацый, якія праводзяць азартныя гульні.

«Пры ўключэнні мадэляў гульнявых аўтаматаў у дзяржаўны рэестр прадугледжана, што могуць прымацца выпрабаванні аўтаматаў, якія праводзіліся ў замежных лабараторыях. Раней гэтай магчымасці не было. З прыняццем указа крыху спрашчаюцца ўмовы ўключэння гульнявых аўтаматаў у дзяржаўны рэестр. Яшчэ адно спрашчэнне вядзення бізнесу — адмена абавязку рэгістрацыі гульнявых аўтаматаў у падатковых органах. Дзейнасць у сферы ігральнага бізнесу вялася такім чынам, што абсталяванне для гульні рэгістравалася ў падатковым органе і яго можна было выкарыстоўваць толькі пасля таго, як яно падключалася да спецыяльнай камп'ютарнай касавай сістэмы. Гэта павялічвала прамежак часу з моманту набыцця абсталявання», — расказаў Уладзімір Муквіч.

Цяпер рэгістраваць у падатковых органах прылады не трэба, гэта функцыя будзе сумешчана з падключэннем аўтамата да касавай сістэмы.

Сапраўдны джэк-пот для ўладальнікаў казіно — змяншэнне стаўкі падаткаў на 50 %, калі абсталяванне выкарыстоўваецца ў падатковым перыядзе менш за 15 дзён, і магчымасць затрымаць выплату выйгрышу ў спрэчных выпадках.

Калі раней букмекерскія канторы прымалі стаўкі з інтэрнэту, то цяпер такую дзейнасць могуць ажыццяўляць толькі віртуальныя ігральныя ўстановы.

Для таго каб установы змаглі прыстасавацца да змен, закон прадугледжвае пераходны перыяд да 1 красавіка 2019 года.

З красавіка 2021 года магчыма блакіроўка віртуальных казіно, якія не атрымалі ліцэнзію.

Будуць удасканальвацца і меры ідэнтыфікацыі карыстальнікаў віртуальных казіно. Прапануўваецца вэб-ідэнтыфікацыя і з выкарыстаннем лічбавага подпісу.

**Марыя ДАДАЛКА**

■ Краіна ў лічбах

# СТАТЫСТЫЦЫ — СЛОВА

**Напярэдадні Дня работнікаў дзяржаўнай статыстыкі, які адзначаецца 23 чэрвеня, старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна МЯДЗВЕДЗЕВА адказала на пытанні журналістаў.**


Фота БелТА.

## Новае ў перапісу

Першы блок пытанняў датычыўся перапісу, які адбудзецца з 4 да 30 кастрычніка 2019 года. Праграма яго правядзення ўжо зацверджана Саветам Міністраў. У апытальніку змешчана 49 пытанняў.

Разам з традыцыйнымі пытаннямі (пол, узрост, адукацыя, памер хатняй гаспадаркі і г. д.) будуць прапанаваны новыя. Пашыраны міграцыйны блок. Будуць пытанні, якія датычацца дадатковай адукацыі. З улікам сітуацыі ў дэмаграфіі, статыстыкі спытаюць у жанчын пра жаданне нараджаць дзяцей.

Асноўная навіна апытальніка 2019 года — тэма сельскай гаспадаркі. Статыстыкі пацікавяцца пра наяўнасць пладова-ягадных насаджэнняў, кустоў, жывёл, птушак і пчоласем'яў. «Гэта трэба толькі для органаў дзяржаўнай статыстыкі, ніякія падатковыя і іншыя органы атрымліваць гэтую інфармацыю не будуць. Гэта з'яўляецца першаснай канфідэнцыяльнай інфармацыяй», — запэўніла старшыня статыстычнага камітэта.

Рыхтуючыся да перапісу, зараз органы дзяржаўнай статыстыкі разам з мясцовымі органамі ўлады і жыллёва-камунальнымі службамі ўдакладняюць адрасную гаспадарку. У лістападзе падключацца рэгістратары, якія, каб улічыць кожнага, хто пражывае ў Беларусі, будуць рэгістраваць усе памяшканні, дзе магчыма пражыванне людзей. «Мы сутыкнуліся з тым, што на дамах няма аншлагаў (шыльдаў з указаннем назвы вуліцы. — **«Зв.»**), адсутнічаюць нумары, — расказала кіраўнік ведамства. — Прадстаўнікі Белстата, ЖКГ звяртаюцца да людзей і самі наносяць назву вуліцы і нумарацыю дамоў на будынкі. Гэта патрэбна не толькі для статыстыкі, ёсць такія жылыя сектары, дзе ўвогуле незразумела, куды ехаць «хуткай дапамозе» або ратавальнікам».

Для правядзення перапісу ў кастрычніку наступнага года задзейнічаюць часовы перапісны персанал, які падбяруць райвыканкамы і аблвыканкамы. Гэта будуць студэнты, работнікі дзяржаўных органаў і дзяржаўнай статыстыкі.

Першыя папярэднія даныя перапісу будуць агучаны на працягу трох месяцаў пасля кастрычніка будучага года, канчатковыя — праз паўтара года.

## Узровень беспрацоўя

Другі блок пытанняў датычыўся ўліку беспрацоўя. «Вы можаце быць цалкам упэўнены, што тая метадалогія, якая сёння выкарыстоўваецца для правядзення выбарачнага даследавання занятасці, цалкам адпавядае міжнародным стандартам, — запэўніла журналістаў Іна Мядзведзева. — Сусветны банк і Міжнародная арганізацыя працы нашы вынікі абследавання пра беспрацоўе ўжо размясцілі на сваіх сайтах». Размова ідзе пра абследаванне сямі тысяч дамашніх гаспадарак, або 11 тысяч чалавек, якім зададзены самыя розныя пытанні: пра прафесію, адукацыю, пошук работы і іншыя. Вынікі даследавання Белстат размяшчае на сваім сайце штоквартальна, і гэта дазваляе адсачыць дынаміку.

«Ёсць метадалагічная розніца ў афіцыйнай ацэнцы беспрацоўя, — папярэдзіла спікер. — Напрыклад, за другі квартал фактычнае беспрацоўе ў Беларусі склала 4,7 % (239,1 тысячы чалавек), і аднесці гэта да рабочай сілы некарэктна, бо трэба ўлічваць і тых, хто знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку, і тых, хто працуе за мяжой без змены грамадзянства».

## Сярэдні заробак

«Як правіла, два пытанні выклікаюць у людзей непаразуменне — сярэдні заробак і інфляцыя, — пагадзілася з журналістамі старшыня Белстата. — Людзі кажуць: «Я столькі не зарабляю» або «У мяне не такая інфляцыя». Мы павінны разумець, што за лічбай стаіць сукупнасць і сапраўды сярэдняя велічыня. Яна атрымана пры зборы ўсёй інфармацыі па заробках, і ёсць людзі, якія атрымліваюць 300 рублёў, і ёсць тыя, хто атрымлівае восем тысяч».

Тое ж самае па інфляцыі. У кожнага чалавека свой спажывецкі кошык. У таго, хто мае невысокі даход, будзе большая доля прадуктаў харчавання, паслуг ЖКГ і транспарту. Але Белстат улічвае і халадзільнікі, і тэлевізары, якія таксама нехта купляе, таму сярэдняя інфляцыя адрозніваецца ад асабістай. Усе разлікі пры гэтым грунтуюцца на міжнародных стандартах і былі падрыхтаваны з удзелам міжнародных экспертаў.

У маі сярэдні намінальны заробак да 200 рублёў атрымалі 1,2 % ад колькасці работнікаў, па якіх атрымана справаздача, ад 200 да 300 рублёў — 2 %, ад 300 да 400 рублёў — 12,1 %, ад 400 да 500 рублёў — 11,5 %, ад 500 да 600 рублёў — 11,5 %, ад 600 да 700 рублёў — 10,8 %, ад 700 да 800 — 9,8 %, ад 800 да 1000 — 15,4 %, ад 1000 да 1500 — 17,2 %, ад 1500 да 2000 — 4,9 %, звыш 2 тысяч — 3,6 %.

Для атрымання дакладных і праўдзівых звестак Белстат заключыў пагадненні з 34 органамі дзяржаўнага кіравання і арганізацыямі пра інфармацыйнае ўзаемадзеянне. Абмен інфармацыяй узаемны. «Статыстычная інфармацыя, якую публікуе Белстат, адпавядае патрабаванням Кодэкса нормаў еўрапейскай статыстыкі — дакладнасць і надзейнасць, — заўважыла Іна Мядзведзева. — Мы рыхтуемся да чарговай адаптаванай глабальнай ацэнкі «Адпаведнасць міжнародным стандартам». Правяраем усе справаздачы на праўдзівасць. Сваю работу будуем, зыходзячы з таго, каб інфармацыя, якую вы атрымліваеце ад нас, была своечасовая, якасная і праўдзівая. Гэта наш прыярытэт».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Блізкая ўлада

# СІСТЭМНЫМ ПРАБЛЕМАМ — ПІЛЬНАЯ ЎВАГА

### Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў падчас прамой лініі адказаў на пытанні больш як дваццаці чалавек

**Дарэчы, добрая тэндэнцыя: колькасць зваротаў у аблвыканкам сёлета на 30 % меншая ў параўнанні з мінулым годам. Паменшылася колькасць зваротаў у выканаўчыя камітэты. Гэта сведчыць пра тое, што ўлада на месцах ведае аб існуючых праблемах і працуе на апярэджанне.**

З вуліцы Церашковай абласнога цэнтра было некалькі званкоў. Гараджане цікавіліся, калі адчыніцца пасля рэканструкцыі крама мясцовай гандлёвай сеткі. Праблема зацягвання здачы пад ключ гандлёвага аб'екта — у новых патрабаваннях будаўнічай экспертызы. Губернатар даручыў паспрыяць таму, каб з наступленнем восені гараджане маглі рабіць тут пакупкі.

Жыхара Віцебска турбавала пытанне даступнасці спартыўных аб'ектаў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У новых спарткомплексах усё неабходнае прадугледжваецца на стадыі праектавання, а ў тых спартыўных залах, басейнах, якія пабудавалі даўно, усё інакш. Старшыня аблвыканкама паабяцаў, што сітуацыя будзе вывучана і пры магчымасці фінансава забяспечана выкананне неабходных работ.

Жыхарка пасёлка Высокае Аршанскага раёна агучыла праблему з уводам у эксплуатацыю станцыі абезжалезвання вады. Дарэчы, яна тыповая для многіх маленькіх населеных пунктаў. Заяўніца расказала, што вада дрэннай якасці: іржавая і з непрыемным пахам. Таму прыходзіцца хадзіць па ваду да калодзежа. А там чарга людзей з пластыкавымі бутылямі. Карцінка, проста, як у савецкія гады па дэфіцытныя тавары. Зразумела, што ў халодную пару года складана такім чынам запасацца вадой. Губернатар пацікавіўся ў кіраўніка сістэмы ЖКГ, калі пытанне будзе вырашана? Яшчэ год таму людзям паабяцалі, што зробяць усё неабходнае, але ж сітуацыя не змянілася да гэтага часу. Губернатар даручыў выправіць становішча. Праект на стадыі экспертызы, ды і грошы ўжо ёсць. Калі прыспешыць тых, ад каго залежыць увод у эксплуатацыю, да наваголняга свята, дзякуючы новай станцыі з кранаў пацячэ вада добрай якасці. Пенсіянерка паабяцала падзяліцца добрай навіной з суседзямі, якія чакаюць, чым скончыцца размова з губернатарам. Ён жа заклікаў мясцовую ўладу зрабіць у пасёлку ўсё, што неабходна для нармальнага жыцця жыхароў.

Яшчэ адзін званок з Оршы быў наконт платнай стаянкі. Маўляў, наогул аўто становіцца ўсё больш, а «начаваць» ім няма дзе. Губернатар патрабаваў, каб у кожным раёне горада былі такія аб'екты інфраструктуры. І, каб кіроўцы былі ўпэўнены, што з іх «коламі» на стаянцы нічога не здарыцца.

А з Гарадоцкага раёна жанчына патэлефанавала, каб расказаць пра праблему з закупам лішкаў малака. Яна трымае дзве каровы, але зборшчык нерэгулярна прыязджае па «белае золата». Безумоўна, такіх гаспадароў трэба падтрымліваць, упэўнены губернатар, яшчэ і таму, што малако ўсё больш запатрабаванае для перапрацоўкі.

Цікава, што паступалі званкі ад людзей, якія выказвалі словы падзякі на адрас тых, хто дапамог вырашыць розныя жыццёвыя пытанні. Губернатар канстатаваў, што такія звароты асабліва прыемныя. Трэба мясцовай уладзе разбірацца з пытаннямі сістэмнага характару больш уважліва, і тады ўсё больш землякоў будуць задаволеныя.

Пасля прамой лініі Мікалай Шарснёў зрабіў выснову, што ўсё больш паступае крытыкі канструктыўнай. І такія звароты дапамагаюць зразумець, якія сістэмныя праблемы патрабуюць вырашэння ў першую чаргу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 20 %) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ГРОДНЕНСКИЙ МЯСОКОМБИНАТ»**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Лот № 1** **Капитальное строение инв. № 400/С-118998** (жилой дом) общей площадью 17,8 кв. м, кирпичное, одноэтажное, 1972 г. п. Отопление печное, электроснабжение – открытая проводка (не функционирует), водопровод, канализация отсутствуют. Составные части и принадлежности: сени, веранда, 3 сарая, погреб с погребней, уборная | | |
| Местонахождение имущества: **Гродненская обл., Гродненский р-н, Поречский с/с, аг. Поречье, ул. Заречная, д. 25** | | | |
| Информация о земельном участке | Площадь 0,2500 га, кадастровый номер 422087507101000878, назначение – для обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения (обременения) прав: земельный участок расположен в водоохранной зоне рек и водоемов (0,2500 га), в охранной зоне электрических сетей (0,0023 га). Право аренды: по 18.12.2116 г. | | |
| Начальная цена | **17 360 бел. руб.** | Сумма задатка (5 %) | **868 бел. руб.** |
| **Сведения о продавце:** ОАО «Гродненский мясокомбинат», г. Гродно, ул. Мясницкая, 25, тел. 8 (0152) 45 50 25 | | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906 | | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 дней с даты подписания протокола торгов. **Оплата:** по договоренности сторон | | | |
| Торги состоятся 7 сентября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8 | | | |
| Срок подачи документов для участия в торгах | **По 3 сентября 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** | | |

**Условия участия и порядок проведения аукциона – www.fincentr.by, тел. 8 (0152) 74 49 11, предыдущая публикация: газета «Звязда» от 21.07.18 г.**

■ Занятасць

# Рэагаваць трэба аператыўна

## Узмоцняць кантроль за арганізацыямі, якія плацяць работнікам ніжэй за мінімалку

**А таксама скароцяць час, за які наймальнікі павінны падаваць звесткі аб супрацоўніках. Гэта прадугледжана адпаведнай пастановай Савета Міністраў.**

Ужо ў кастрычніку работадаўцы абавязаны будуць падаць звесткі за дзевяць месяцаў па тых, хто выконвае работы па грамадзянска-прававых дагаворах. Даныя патрэбны, каб карэктна сфарміраваць базу працаздольных грамадзян, не занятых у эканоміцы.

З наступнага года інфармацыю аб суме выплат, якія ўлічваюць прыназначэнні пенсіі, і страхавых узносах (форму ПУ-3) работадаўцы будуць падаваць кожны квартал, а не раз у год. Тыя арганізацыі, якія плацяць супрацоўнікам ніжэй за мінімальны заробак, абавяжуць указваць прычыны такой сітуацыі. У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны тлумачаць, што гэта паспрыяе своечасоваму выяўленню наймальнікаў, якія парушаюць заканадаўства, і аднаўленню правой застрахаваных асоб. Органы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва змогуць аператыўна рэагаваць на выпадкі непрадстаўлення індывідуальных звестак па работніках.

Фізічныя асобы, якія самастойна сплачваюць абавязковыя страхавыя ўзносы, павінны будуць падаваць форму ПУ-3 не пазней за 31 сакавіка (раней быў установлены тэрмін не пазней за 1 мая).

З 1 ліпеня 2019 года звесткі аб прыёме і звальненні работнікаў (форма ПУ-2) будуць падавацца ў новым фармаце. Неабходна будзе ўказваць формы працоўных адносін, падставы звальнення, найменні пасад, на якія прыняты ці пераведзены супрацоўнікі. Гэта інфармацыя дазволіць вызначаць патрэбу эканомікі ў работніках па асноўных групах дзейнасці і аператыўна рэагаваць на магчымы дысбаланс на рынку працы, бачыць, у якім рэгіёне ёсць недахоп (ці лішак) спецыялістаў. Органы змогуць выяўляць прычыны цякучкі кадраў, стымуляваць наймальнікаў захоўваць заканадаўства, легалізаваць працоўную дзейнасць, праводзіць прафілактычныя мерапрыемствы ў адносінах да тых, хто схільны да асацыяльнага ладу жыцця. Тэрмін падачы формы ПУ-2 скароцяць да 10 чысла месяца, наступнага за справаздачным кварталам.

Новыя меры стануць базай для ўкаранення электроннай працоўнай кніжкі. Так, з 1 ліпеня 2019 года адкрываць індывідуальныя асабовы рахунак застрахаванай асобы для грамадзян, у пашпарце якіх указаны ідэнтыфікацыйны нумар, будуць на падставе формаў ПУ-2 і ПУ-3. Актуалізаваць гэтыя даныя ўжо не патрэбна, што скарачае дакументаабарот і эканоміць час плацельшчыкаў абавязковых страхавых узносаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Будзьце пільныя!

# «Моднае» злачынства

**Развіваюцца тэхналогіі, а разам з імі, на жаль, развіваецца і злачыннасць. Зламыснікі ўсё больш упэўнена асвойваюць кіберпрастору, пераносячы ў віртуальны свет сферу сваіх інтарэсаў.**

Апошнім часам многіх займае такая кібернавінка, як крыптавалюта. Адны імкнуцца набыць тое, што мае вялікія перспектывы як навамодны сродак плацяжу. Другія хочуць яго прадаць. Усё б нічога, але часам на падобных здзелках нажываюцца нячыстыя на руку людзі.

Адзін з такіх выпадкаў адбыўся нядаўна. 21-гадовы жыхар Барысава размясціў у інтэрнэце аб'яву аб продажы крыптавалюты. Гэтай аб'явай зацікавіўся жыхар Гродна, выказаўшы жаданне купіць «тавар» за 14 тысяч рублёў. Яны сустрэліся ў сталіцы, і прадавец прадэманстраваў пакупніку мабільную праграму, якая імітавала залічэнне крыптавалюты на рахунак. Пакупнік паверыў, і здзелка адбылася. Калі ж пакупнік вярнуўся дадому, то выявіў, што ніякай крыптавалюты на яго рахунак не паступала, а праграма, якую яму прадэманстраваў прадавец, працавала ў тэставым рэжыме.

У дачыненні да «прадаўца» заведзена крымінальная справа па артыкуле «Махлярства, здзейсненае ў буйным памеры». Канфіскаваны мабільны тэлефон для таго, каб даследаваць спосаб здзяйснення злачынства.

Зараз расследаванне працягваецца.

**Сяргей КУЛАКОЎ**

# Узбекскі нумар часопіса «Беларусь»

**Грамадска-палітычны штомесячнік «Беларусь» выходзіць трыма выпускамі — на розных мовах: беларускай і рускай, кітайскай і англійскай.**

Традыцыяй стала рыхтаваць спецыяльныя выпускі выдання, прысвечаныя тым ці іншым краінам, развіццю адносін з якімі дадаецца пэўны прыярытэт. Жнівеньскі нумар «Беларусі» пабачыў свет з «узбекскім выпускам», які адкрываецца гутаркай з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь спадаром Насірджанам Юсупавым. Амбасадар расказвае пра тыя абсягі эканамічных і палітычных зносін, якія сёння характарызуюць памкненні нашых краін да сумесных крокаў у развіцці партнёрства. «Паміж нашымі народамі, хоць геаграфічна яны далёкія, вельмі шмат агульнага. Беларусы — гэта такі самы добры, адкрыты, душэўны народ, як і ўзбекі», — выказвае такую думку Насірджан Юсупаў.

У жнівеньскай «Беларусі» — падрабязны расповед пра жыццё і творчасць народнага песняра Беларусі Якуба Коласа ў Ташкенце ў час Вялікай Айчыннай вайны. Між іншым, са сталіцай Узбекістана звязаны і лёсы іншых літаратараў Беларусі — Сцяпана Ліхадзіеўскага, Эдзі Агняцвет, Міхася Модэля, Аркадзя Мардвілкі, Віктара Галаўчынера. Пра беларуска-ўзбекскія літаратурныя сувязі таксама вы зможаце прачытаць на старонках жнівеньскай «Беларусі». «Казбек і іншыя» — нарыс пра узбекістанцаў, якія вызвалялі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ёсць у часопісе і старонкі пра нашага земляка з Магілёўшчыны — Героя Савецкага Саюза Гемела Станкевіча, у гонар якога была названа адна з вуліц Ташкента. А яшчэ ў часопісе вы сустрэнецеся з народнай паэтэсай Узбекістана Зульфіёй, два паэтычныя зборнікі якой былі выдадзены ў Мінску на беларускай мове. Яшчэ ў 1960-я гады Зульфія прыязджала ў Мінск, гасцявала ў іншых гарадах Беларусі, а ў час вайны сустракалася ў Ташкенце з Якубам Коласам.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Культасвета

# НАЗАД У 70-Я

## Нацыянальны гістарычны музей і Wargaming сумясцілі рэальнасць з віртуальнасцю

**Убачыць унікальныя архіўныя фотаздымкі Мінска, зробленыя амаль паўстагоддзя таму, і адноўленыя на іх аснове лакацыі сусветна вядомай анлайн-гульні «World of Tanks» і траціць з дапамогай першых і другіх у беларускую сталіцу 60—70-х змогуць усе наведвальнікі незвычайнай перасоўнай выстаўкі «Мінск рэальны і віртуальны».**



Экспазіцыя — своеасаблівы падарунак Мінску ад Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі і кампаніі Wargaming. Усе ахвотныя могуць параўнаць рэальныя фотаздымкі, зробленыя з 1956 да 1984 года, і скрыншоты з гульні і ацаніць маштаб і глыбіню працы каманды з больш як 45 мастакоў і тэхнічных спецыялістаў, якія цягам 10 месяцаў у шчыльным кантакце з гісторыкамі «ажыўлялі» ў віртуальнасці ўчастак Мінска, ключавымі кропкамі якога сталі плошча Перамогі, Белдзяржцырк, Дом-музей I з'езда РСДРП, Оперны тэатр і парк імя Горкага. «Плошча ўчастка прыкладна кіламетр на кіламетр, — заўважае **прадукт-менеджар Мінскага цэнтра распрацоўкі WoT Ілья ФУКАЛАЎ**, — і нашай задачай было зрабіць карту не толькі прыгожай, але і максімальна рэалістычнай».

— Прыемна тое, як адказна і беражліва распрацоўшчыкі гульні падышлі да рэалізацыі праекта — паказаць як мага большай колькасці людзей Мінск 60—70-х гадоў, калі горад яшчэ працягваў аднаўляцца пасля вайны. Магчыма, у перспектыве гэты момант «выстраліць» у турыстычным і культурным плане, калі гульцы з розных краін свету захочуць на ўласныя вочы ўбачыць, як выглядае Мінск сёння, — адзначае **дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Павел САПОЦЬКА.**

Выстаўка будзе праходзіць у Нацыянальным гістарычным музеі да 24 жніўня, потым пераедзе ў гандлёва-забаўляльны цэнтр «Galleria Minsk», а фінішуе 9 верасня ў парку Перамогі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Венесуэла дэвальвавала балівар



Улады Венесуэлы праводзяць адну з самых маштабных дэвальвацый у сусветнай гісторыі, у выніку якой афіцыйны абменны курс балівара будзе зніжаны на 96 працэнтаў. Калі ў пятніцу, 17 жніўня, афіцыйны курс долара, усталяваны венесуэльскім Цэнтрабанкам, складаў каля 248 тысяч балівараў за долар, то новы курс, які ўступіў у сілу, роўны 6 мільёнам балівараў за долар — розніца ў 24 разы. Аб валютнай рэформе абвясціў прэзідэнт краіны Нікалас Мадура ў тэлезвароце на мінулых выхадных. «Я хачу, каб краіна аднавілася, і ў мяне ёсць рэцэпт. Даверцеся мне», — сказаў кіраўнік дзяржавы, словы якога прыводзіць CNBC. Мадура фармальна не абвясціў аб дэвальвацыі: ён паведаміў, што ўрад праводзіць дэнамінацыю (у мясцовых грошай прыбяруць пяць нулёў). І новы дэнамінаваны балівар будзе перайменаваны ў «суверэнны балівар». Яго курс будзе прывязаны да венесуэльскай крыптавалюты: адзін Petro роўны кошту барэля венесуэльскай нафты (60 долараў), ці 3,6 тысячы новых балівараў (360 млн да дэнамінацыі). Адсюль новы валютны курс — 6 млн старых балівараў за долар, перадае РБК. У абарачэнне павінны з'явіцца новыя купюры ў 200 балівараў з партрэтам нацыянальнага героя краіны Франсіска дэ Міранды і 500 балівараў з выявай Сімона Балівара. Акрамя таго, пасля доўгага перапынку ў Венесуэлу вернуцца манеты. Каб аслабіць наступствы для насельніцтва, улады адначасова на 6 тысяч працэнтаў павысілі мінімальны памер аплаты працы — да 1,8 тысячы новых балівараў у месяц, або да 30 долараў (з 0,5 долара).

### Кіраўнік МЗС Ірана абвінавачвае ЗША ў падрыхтоўцы дзяржперавароту ў краіне



Міністр замежных спраў Ірана Махамад Джавад Зарыф заявіў, што ЗША стварылі ў Дзяржддэпартаменце ініцыятыўную групу з мэтай падрыхтоўкі дзяржаўнага перавароту ў краіне. Пра гэта ён напісаў у «Твітэры». «65 гадоў таму ЗША зрынулі абраны народам дэмакратычны ўрад Масадыка, аднавіўшы дыктатуру і падпарадкаваўшы іранцаў на наступныя 25 гадоў. Цяпер ініцыятыўная група плануе ажыццявіць тое ж самае шляхам ціску, дэзынфармацыі і дэмагогіі. У яе нічога не выйдзе», — гаворыцца ў твіце міністра. Як вядома, днямі Дзярждэп абвясціў аб стварэнні групы для каардынацыі сваёй палітыкі ў дачыненні да Ірана. Яе работай будзе кіраваць Браян Хук, які стане спецпрадстаўніком ЗША па Іране. Ён заявіў журналістам, што аб'ява аб фарміраванні групы ў гадавіну аперацыі спецслужбаў ЗША і Вялікабрытаніі па звяржэнні ў Тэгеране ўрада прэм'ера-рэфарматара Махамеда Масадыка ў 1953 годзе — гэта «чыстае супадзенне».

### Forbes апублікаваў спіс самых высокааплатных актрыс



Топ-10 гэтага рэйтынга ўзначаліла 33-гадовая амерыканская актрыса Скарлет Ёхансан (продкі якой, між іншым, паходзяць з Нясвіжа), якая зарабіла 40,5 мільёна долараў. Большую частку гэтых грошай ёй прынёс удзел у здымках фільма «Мсціўцы». Другое месца ў рэйтынгу заняла Анджаліна Джалі. Яна зарабіла 28 мільёнаў долараў, у асноўным дзякуючы працы ў фільме «Малефісента-2», прэм'ера якога адбудзецца ў 2020 годзе. На трэцім месцы — Джэніфер Эністан, якая зарабіла больш за 19,5 мільёна долараў. У дзясятку самых высокааплатных актрыс гэтага года таксама ўвайшлі: Джэніфер Лоўрэнс, Рыз Уізерспун, Міла Куніс, Джулія Робертс, Кейт Бланшэт, Меліса Макарці і Галь Гадот.

# РЭВІЗІЯ ПЕРАД ЗІМОЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Абысці гэты момант можна далёка не заўжды, але выйсце ёсць: дастаткова зрабіць больш моцную кладку ў гэтым месцы. Сам комін таксама трэба прачысціць ад сажы — тым больш што надвор'е гэтаму спрыяе. Для комінаў таксама нельга выкарыстоўваць керамічныя, азбестацэментныя і металічныя трубы. Дапускаецца толькі звычайная гліняная цэгла.

Ліпень у гэтым годзе выдаўся багаты на дажджы. Па даных Белгідрамета, месцамі па краіне выпала нават тры месячныя нормы ападкаў! Дажджы нярэдка былі інтэнсіўныя і суправаджаліся градам. Усё гэта магло пашкодзіць герметычнасць цаглянай кладкі коміна. Што пасля можа выклікаць і пажар.

**З-за парушэння правілаў пажарнай бяспекі пры мантажы пячнога абсталявання з пачатку года на тэрыторыі Мінскай вобласці адбылося 46 пажараў. Загінуў адзін чалавек. Няправільная эксплуатацыя печак выклікала 224 пажары, якія забралі 11 жыццяў.**



— Падчас работы печкі з топачнай адтуліны можа выпадкова выпасці гарачае вугалле, — працягвае Анастасія Швайбовіч. — Прапаліць драўляную падлогу для яго — справа некалькіх секундаў. Каб гэтага не адбылося, трэба перад топкай прыбіць металічны ліст памерам не менш за 50x70 сантыметраў. Пашкоджаны ліст лепш замяніць. Ну а калі печка ў вашым доме ўжо разабрана або яе ролю спачатку выконваў газавы кацёл, то для яго абслугоўвання трэба зрабіць заказ у спецыялізаваную арганізацыю. Таксама нельга каля печкі складзіраваць рэчы, зробленыя з гаручых матэрыялаў: мэблю, вопратку, паперу... Іх трэба аднесці на адлегласць не менш чым паўтара метра.

Яшчэ адна патэнцыйная крыніца небяспекі — электраправодка. Чым меншая даўжыня светлавога дня, тым больш часу мы праводзім пад дахам. А праводка шмат дзе не мянялася дзесяцігоддзямі, ды і фізічны знос скруткаў дратоў і аслабленне зацягнутасці кантактаў ніхто не адмяняў. У той жа час колькасць прыбораў за гэты час павялічылася. Менавіта таму нельга ўключаць некалькі магутных апаратаў адначасова ў адну разетку.

Распазнаць тое, што электрасетка перагружана, вельмі проста. Індыкатар гэтага — калі пры ўключэнні любога прыбора лямпачка пачынае гарэць крыху цямней. У такім разе трэба тэрмінова выклікаць спецыяліста, каб ён выправіў становішча.

Пры гэтым трэба памятаць, што частку работ можна правесці толькі ў цёплую пару года. Да іх адносяцца, напрыклад, рамонт цаглянай кладкі на гарышчы або замена электрычнай праводкі на адкрытым паветры. Таму не губляйце вельмі каштоўны час, пакуль лета нас яшчэ песціць цёплымі дзянькамі.

— Мы рэкамендуем усталяваць аўтаномны пажарны апавяшчальнік, калі яго па якіх-небудзь прычынах у вас няма, — кажа Анастасія Швайбовіч. — Значная частка пажараў узнікае ўначы, калі людзі спяць. Ува сне мы не чуем ніякіх пахаў, і таму чадны газ заб'е чалавека за лічаныя хвіліны. Апавяшчальнік жа разбудзіць гаспадара хаты і дапаможа знайсці крыніцу ўзгарання на ранняй стадыі. Так, сёлета ў Мінскай вобласці гэтыя невялічкія прыборы ўратавалі адзінаццаць жыццяў! Канешне, прыбор мусіць пастаянна ўтрымлівацца ў рабочым стане.

Са свайго досведу: адной батарэі для апавяшчальніка хапае сама меней на год. Калі ж зарад пачынае набліжацца да нуля, апавяшчальнік пачынае пра гэта сігналіць. Батарэі сілкавання тыпу «Крона» прадаюцца ў любой краме гаспадарчых тавараў і каштуюць у межах 1-2 рублёў. Пагадзіцеся, гэта невялікі кошт уласнай бяспекі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

### Тым часам

З 20 жніўня па 21 верасня ў краіне праходзіць рэспубліканская акцыя «У цэнтры ўвагі — дзеці». У гэтыя дні ратавальнікаў і актывістаў Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі ратавальнікаў-пажарных можна сустрэць у гандлёвых цэнтрах, дзе прадаюцца тавары для школы. Яны нагадаюць дзецям і дарослым жыццёва неабходныя правілы бяспекі. З 1 па 14 верасня супрацоўнікі МНС перамесяцца ў школы. Яны прымуць удзел ва ўрачыстых школьных лінейках, правядуць першыя ўрокі бяспекі. А з 17 верасня ратавальнікі прыйдуць да самых маленькіх — у дзіцячыя садкі. Яны арганізуюць тэатралізаваныя прадстаўленні і гульні. А аб правілах бяспекі раскажуць героі спецыялізаванага мультсерыяла «Чароўная кніга».

# Школьны абед: смачна, карысна, прыгожа

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На думку Валерыя Шылава, школам трэба больш актыўна ўкараняць такую сістэму арганізацыі харчавання, як шведскі стол.

— У навучальных установах, дзе дзеці могуць выбіраць з прапанаваных страў, адходаў практычна не бывае. Акрамя таго захоўваецца прынцып разнастайнасці — адзін з асноўных у здаровым харчаванні, — падкрэсліў спецыяліст. — Думаю, што трэба задумацца і пра ўвядзенне кантэйнернага харчавання, якое магло б вырашыць шэраг праблем: і з бяспечнасцю харчавання, і з карупцыйным складнікам арганізацыі гэтага працэсу...

Але не ўсе падзяляюць яго думку.

— Школьнае харчаванне нясе яшчэ і выхаваўчую функцыю: сервіроўка сталоў, сталовыя прыборы, сурвэткі — усё накіравана на выхаванне культуры харчавання ў навучэнцаў, — падкрэслівае **выконваючая абавязкі загадчыка аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ірына ПАЗНЯК.** — Салата, па нашых патрабаваннях, абавязкова павінна быць у асобным посудзе. Пэўная тэмпература страў таксама ўплывае на смакавыя рэцэптары. Што датычыцца шведскага стала, то гэту мадэль праблематычна прымяніць на перапынку, які доўжыцца 10—15 хвілін. Каб школьнікі паспелі за гэты час падсілкавацца, сталы ім накрываюць загадзя.

У сталіцы ёсць прыкладна 5—7 устаноў адукацыі, дзе дзейнічаюць элементы шведскага стала: гэта мадэль больш падыходзіць для старшых школьнікаў, якія не будуць штурхацца ў чарзе, якія ўжо могуць зрабіць свядомы выбар. Яна мала падыходзіць для вучняў сярэдніх класаў і зусім не падыходзіць для малодшых школьнікаў.

Між іншым, выбарачнае анкетаванне, праведзенае санітарнай



службай некалькі гадоў таму, паказала, што на першым месцы сярод прычын, па якіх дзеці адмаўляюцца харчавацца ў школе, стаіць знешні выгляд кухараў. Калі дзіця ўбачыць неакуратнага работніка сталовай ці ў кухара будуць брудныя рукі, яно ніколі не будзе там харчавацца. Эстэтычны бок (знешні выгляд абслуговага персаналу, сервіроўка сталоў, посуд, афармленне памяшканняў сталовых, мэбля) насамрэч вельмі важны.

А ці ведаеце вы, чаму дзеці адмаўляюцца піць у школьнай сталовай чай ці кампот? Таму што яны ім здаюцца занадта салодкімі. І зусім небеспадстаўна...

— Харчовыя звычкі змяняюцца. Гэта раней мы ўсе пілі чай з дзвюма лыжкамі цукру, — разважае **загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА.** — А хто цяпер так робіць дома? Таму наша рэкамендацыя — зменшыць у рацыёне школьнікаў утрыманне цукру. Мы накіравалі ліст на адрас усіх дзяржаўных органаў — Міністэрства антыманапольнага рэгулявання, абласных выканкамаў, Міністэрства адукацыі — з рэкамендацыяй у рэцэптурах страў для школьнікаў паменшыць утрыманне цукру на 30—35 працэнтаў і солі — на 20—25 працэнтаў. Штогод у краіне сярод дзіцячага насельніцтва рэгіструюцца 300 новых выпадкаў цукровага дыябету і 400 выпадкаў гіпертэнзіі. З гэтым трэба штосьці рабіць!

Ала Малахава ўдакладніла, што па рэкамендацыях Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, дзеці павінны атрымліваць 5-6 грамаў солі ў суткі, а ў Беларусі ў нормах харчавання прапісаны 8-9 грамаў. Таксама ў сувязі з тым, што дзеці недастаткова атрымліваюць у нас малака і, адпаведна, кальцыю, цяпер абмяркоўваецца на ўзроўні міністэрстваў увядзенне ў рацыён школьнікаў дадатковага малака ці кісламалочных прадуктаў. Бацькам, дзеці якіх харчуюцца за ўласныя сродкі, таксама будзе прапанавана дадаткова выкарыстоўваць у рацыёне малако і малочныя прадукты.

Спецыяліст нагадала, што перапынкі паміж прыёмам ежы ў дзяцей не павінны перавышаць 3,5—4 гадзіны. Пра гэта павінны памятаць бацькі, якія адпраўляюць сваё дзіця ў школу. А калі вучань знаходзіцца ва ўстанове адукацыі да вечара, то трэба паклапаціцца пра дадатковы прыём ежы, няважна дзе: у сталовай, буфеце ці ў школьным кафэ. Сем-восем гадзін без харчавання — гэта проста недапушчальна!

Што датычыцца школьных буфетаў, то не сакрэт, што часта там прадаюцца прадукты, якія не маюць аніякага дачынення да здаровага харчавання:

— Самая галоўная праблема ў тым, што дырэктары школ не лічаць школьны буфет сваёй тэрыторыяй, — канстатуе Ала Малахава. — А менавіта кіраўнік установы павінен дыктаваць, што там прадаваць. Трэба ўстаць на пазіцыі здаровага харчавання, зменшыць там прысутнасць кандытарскіх вырабаў, прысмакаў і іншай некарыснай ежы.

У асартыменце буфетаў павінны прысутнічаць сокі, фруктовыя або пладовыя нектары, агароднінныя, малочныя, кісламалочныя прадукты, у тым ліку ўзбагачаныя мікранутрыентамі. Рэкамендуецца таксама продаж гематагену, мармеладу і зефіру. А вось асартымент цукерак, шакаладных батончыкаў, карамелі, пячэння трэба абмежаваць.

**Намеснік начальніка аддзела грамадскага харчавання галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Марына ДЗЬЯКАВА** расказала, што ў Мінску да новага навучальнага года распрацавалі адзінае для ўсіх школ двухтыднёвае меню. Рацыён распрацаваны для розных узроставых груп навучэнцаў: ад 6 да 10 гадоў, ад 11 да 13 і ад 14 да 17 гадоў. Пры складанні меню ўлічваліся патрабаванні ў плане захавання сезоннасці, рацыянальнага размеркавання агульнай каларыйнасці сутачнага рацыёну, аптымальных суадносін харчовых рэчываў (бялкоў, тлушчаў і вугляводаў), выкарыстання прадуктаў, дазволеных для харчавання дзяцей. Таксама стравы не могуць паўтарацца ў меню два дні запар. У сталіцы харчаванне вучняў арганізуюць дзевяць раённых камбінатаў школьнага харчавання. Яны абслугоўваюць 251 аб'ект пры ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Гарачым харчаваннем ахоплена 96 працэнтаў школьнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ■ Сезон

### Пачалося паляванне на капытных

**У перыяд з 20 жніўня па 30 верасня ў краіне дазволена здабываць дарослых самцоў лася, высакароднага і плямістага алення, ланi, а таксама селекцыйных жывёл гэтых відаў любога полу і ўзросту.**

Як нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, паляванне можа праводзіцца на працягу сутак спосабамі з засады і з падыходу. Дазваляецца выкарыстоўваць наразную (з дульнай энергіяй кулі звыш 3000 джоуляў), гладкаствольную (з выкарыстаннем патронаў з куляй) і кідальную (лукі і арбалеты) паляўнічую зброю.

Па 30 верасня працягнецца паляванне на казулю (якое адкрылася 15 мая), здабываць можна таксама дарослых самцоў і селекцыйных асобін.

### Для аленяў — новы дом

**Звыш 300 высакародных аленяў плануецца рассяліць у 11 паляўнічых гаспадарках Беларусі ў асенне-зімовым сезоне 2018—2019 гадоў, паведамілі ў Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў (БТПР).**

Пачынаючы з 2014 года завезена ў паляўнічыя ўгоддзі звыш 950 асобін жывёлы. У асенне-зімовы перыяд 2017—2018 гадоў больш за 350 аленяў трапілі ў Верхнядзвінскі, Драгічынскі, Мазырскі, Ашмянскі, Рэчыцкі, Чашніцкі, Чэрвенскі, Шаркаўшчынскі, Шклоўскі раёны. У цяперашні час праводзіцца работа па выпуску жывёл з вальераў у паляўнічыя ўгоддзі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ След на зямлі

# «РУКІ ПА-РАНЕЙШАМУ ПРОСЯЦЬ РАБОТЫ...»

**...Калі знаёмец расказваў, што ў аграгарадку Войстам жыве «прасунуты» дзядуля, які не толькі піша, але і выдае свае кнігі, я толькі ўсміхалася, бо ўяўленне малявала хіба аркушы з прымітыўнымі тэкстамі, сшытыя стэплерам. Калі ж пры выпадку зазірнула да мясцовага «выдаўца», — на добрыя паўгадзіны страціла мову, бо ўбачыла ўласнаручна напісаныя, звярстаныя, акуратна прашытыя кнігі ў цвёрдай вокладцы. Ізноў прыгадалася ўстойлівае выслоўе, што ў Беларусі на кожнай печы вясковай хаты сядзіць альбо паэт, альбо празаік.**



Мар'ян Дзевяцень не прэтэндуе на званне літаратара, кажа, што ніколі раней ні вершаў, ні апавяданняў не пісаў, нават у гады рамантычнага юнацтва... Праўда, яго землякі згадваюць, што гадоў трыццаць таму знаходзілі на сваіх падворках вершаваныя ўлёткі, у якіх жартаўліва і не абразліва выкрываліся асобныя недахопы ці нетыповыя паводзіны некаторых дзецюкоў ды паненак...

Хто на такое здольны, большасці было зразумела, але, як кажуць, за руку не злавілі. Што да меншасці, якая трапіла на вострае пяро мясцовага сатырыка, то яна мусіла выпраўляцца, каб не быць асмяянай яшчэ раз.

Не сакрэт, што, каб добра пісаць, складаць вершы, трэба шмат чытаць. На гэта, як ні цяжка было (праца, сям'я, вялікая гаспадарка), Мар'ян Дзевяцень заўсёды выкройваў час. Дзесяцігодку ён скончыў толькі ў дзевятнаццаць (раней — перашкаджала вайна), вучыўся ў Жыровіцкім тэхнікуме, служыў у войску. Быў камандзірам так званага хімічнага аддзялення пры аэрадроме, асвоіў прафесію кіроўцы, што дазволіла атрымаць добрую работу. І менавіта ў калгасе, бо з'язджаць з родных мясцін ён жадання не меў — не мог развітацца з маляўнічымі краявідамі, што атулялі яго родную вёсачку Навасады.

Кнігі былі яго дарадцамі, з імі лягчэй было адольваць любыя жыццёвыя цяжкасці і нават трагедыі. Калі загінула каханая жонка, пакінуўшы яго з дзвюма дочкамі (меншая толькі пайшла ў першы клас), Мар'ян Антонавіч не збег, як некаторыя, у алкагольны ці іншы тлум: ён, не цураючыся ніякай работы, годна выконваў свой бацькоўскі абавязак, і ўсё, за што браўся, рабіў акуратна і якасна. У прыватнасці, дом, пабудаваны больш як паўвека таму, да сёння выглядае досыць дыхтоўным, дагледжаны гаспадарчыя пабудовы, пчальнік. У пуні захоўваюцца такарны і свідравальны станкі, шматлікія прыстасаванні, зробленыя некалі сваімі рукамі. Да Мар'яна Антонавіча часцяком наведваліся суседзі з просьбай нешта адрамантаваць, выстругаць, дапамагчы... Яшчэ летась гаспадар пад заказ зрабіў тумбачку.

...Карацей, рукі па-ранейшаму просяць работы, а жывы зацікаўлены розум знаходзіць занятак. Напісаныя доўгімі зімовымі вечарамі вершы і мастацкія творы Мар'ян Дзевяцень не прапаноўваў рэдакцыям ці выдаўцам (хіба на радыё неяк паслаў эсэ, якое неўзабаве прагучала ў эфіры).

А наогул, як сам прызнаецца, піша, каб мець занятак, каб нешта каштоўнае пакінуць сваім нашчадкам: дзецям і ўнукам.

У свае 83 ён асвоіў паліграфічную справу, праграмы набору і вёрсткі, аперацыі складанай фальцоўкі і сшывання асобных сшыткаў у кніжны блок. Не маючы паліграфічнага абсталявання, але дазнаўшыся пра асновы друкарскай справы, Мар'ян Антонавіч саматугам стварае кніжкі. У іх не толькі своеасаблівы летапіс войстамскай зямлі з імёнамі ды мянушкамі вяскоўцаў, з цікавымі падзеямі ранейшага жыцця, штодзённымі заняткамі, гульнямі... У «Памяці сэрца» і «Родных сцежках» — душэўны стан сапраўднага беларуса, прыстойнага чалавека, сына сваёй зямлі.

**Ала СТРАШЫНСКАЯ,**
*г. Смаргонь*

■ Год малой радзімы

# БЫЛІ МАЙСТРЫ... І БУДУЦЬ?

**Мястэчка Поразава багатае на цікавыя гістарычныя падзеі. У краіне, ды і далёка за яе межамі, яно вядомае сваім ганчарствам. Паводле даных 1935 года, гэтым промыслам тут займаліся 75 сям'яў. Прафесійныя навыкі і вопыт перадаваліся ад бацькоў да дзяцей. З гліны яны выраблялі чорнаглянцаваны марэнавы ці дымлены керамічны посуд.**



У Поразаўскай бібліятэцы амаль год ужо дзейнічае музейны пакой «Мастацтва гліны і агню», дзе наведвальнікі могуць пазнаёміцца з працэсам падрыхтоўкі і тэхналогіяй вырабу керамікі, са спецыяльнымі прыстасаваннямі і рыштункам. Яны ж маюць магчымасць ацаніць прыгажосць і зручнасць гэтых вырабаў, даведацца, што гаршкі, напрыклад, выкарыстоўваліся для гатавання ежы, бабачнікі — для выпякання булак ці бабак, кубкі — для напояў, макацёр — для расцірання маку ці льнянога семя, збаны — для малака, спарышы ці пітушкі — для, так бы мовіць, «комплексных абедаў»...

Ганчароў з Поразава ў ваколіц называлі «гаршчэчнікі». Сярод іх — цэлыя сямейныя дынастыі Паплаўскіх, Крыцкіх, Чарапкоў, Шалкевічаў, Раманоўскіх, Пінютаў, Козюкаў. Самым жа вядомым майстрам быў Іосіф Іосіфавіч Шопік: яго серабрыста-чорная задымленая кераміка з'яўляецца своеасаблівым сімвалам ганчарнага рамяства Прынямоння. За свае па-майстэрску выкананыя работы гэты поразаўскі ганчар узнагароджаны бронзавым медалём ВДНГ СССР, яго вырабы захоўваюцца ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь...

На жаль, у мястэчку няма больш ніводнай хаты, дзе круцілася б ганчарнае кола, нараджаўся новы керамічны посуд. Сёння поразаўская кераміка знаходзіцца ў прыватных калекцыях і сярод музейных экспанатаў, біяграфіі майстроў — у сямейных архівах, памяці родных людзей ды на стэндах музейнага пакоя «Мастацтва гліны і агню». А гэта... даваляе спадзявацца, што яно, мастацтва, магчыма, яшчэ і адродзіцца?

**Н. У. КАЛАЧ,**
**загадчыца аддзела маркетынгу Свіслацкай раённай бібліятэкі**

■ Чалавек — чалавеку

# Рабіць дабро...

**У Мінску, у іншых вялікіх гарадах не-не ды і сустрэнеш звычайных і ў той жа час незвычайных жанчын — у белых касынках, з адмысловымі скарбонкамі. Да іх падыходзяць людзі, ахвяруюць грошы, падаюць запіскі, аб нечым пытаюць... Сёстры міласэрнасці ўважліва слухаюць, адказваюць на пытанні.**

Да адной з іх падышла і я, каб пацікавіцца, як «набываецца» такая прафесія?

— Я з маленства верыла ў Бога, малілася, хадзіла ў храм, — расказвае сястра Святлана. — Потым з'явілася жаданне служыць, і бацюшка благаславіў мяне. У храме выдалі адпаведнае адзенне, скарбонку. Ніхто не сказаў, колькі гадзін мне абавязкова трэба будзе стаяць, збіраць ахвяраванні... Можна дзве гадзіны, можна — дзесяць. Бог дае сілы, хоць гэта, бывае, і цяжка, асабліва зімой. Даводзіцца стаяць на марозе, на скразняках, адзяваць па некалькі пар шкарпэтак, валёнкі, цёплыя рэчы пад куртку ці паліто... Мы, сёстры, усе розныя, у кожнай свой лёс, і часам ён вельмі няпросты.

Сястра Святлана ведае, аб чым гаворыць, бо сама прайшла праз анкалагічнае захворванне, пахавала бацькоў, не мае, на жаль, сям'і... Клапоціцца пра састарэлых, людзей з інваліднасцю і без пастаяннага месца жыхарства, падкормлівае бяздомных катоў і сабак.

— Рабіць дабро, — лічыць Святлана, — абавязак кожнага чалавека. А для нас — сясцёр міласэрнасці — гэта яшчэ і сэнс жыцця.

**Святлана НЯРОНСКАЯ,**
*г. Мінск*

■ Так ці не? Практыкум

# Залоўка не ятроўка, а голад — не дзядзіна...

**«Прачытаў, што дзве маладзіцы паміж сабою — швагеркі, і адразу палез у тлумачальны слоўнік. Там напісана, што швагерка — жончына сястра. Атрымліваецца, што паміж сабой жанчыны могуць быць ятроўкамі, калі замужам за братамі?**
**Калі ж адна з іх замужам за братам другой, тады першая для другой братавая, а другая для першай залвіца. Так ці не?» — пытае спадар Старых з Гомеля.**
**Спадарыня Вікторыя з Асіповічаў цікавіцца, як па-беларуску «поспорить» (у сэнсе на нешта) і ці ёсць у нашай мове слова «прадастаўляць».**

**На моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.**

1. У нашай мове ёсць шмат слоў, якія абазначаюць жанчын паводле адносін да іншых людзей у сям'і, родзе. Аднак тут мы нагадаем значэнні толькі некаторых, магчыма, менш ужывальных:

бра́тавая — жонка брата;
дзя́дзіна — жонка дзядзькі;
залоўка (залві́ца) — сястра мужа;
шваге́рка — сястра жонкі;
ятроўка — жонка аднаго брата ў адносінах да жонкі другога.

Усе гэтыя словы былі патрэбнымі і карыснымі нашым продкам на працягу стагоддзяў. А значыць, могуць паслужыць і нам, зразумела ж, калі выкарыстоўваць іх у адпаведнасці са значэннямі.

2. У рускай мове ёсць выразы «держать пари», «идти на пари».

У нашай мове іх сэнс перадаецца адпаведнымі ўстойлівымі спалучэннямі са словам «заклад»: мы гаворым **пайсці ў заклад (пабіцца аб заклад), выйграць заклад.** А зварот *спорим, что* (нехта нешта зробіць або не зробіць) можна перадаць як **гатовы пабіцца аб заклад, што** або **іду ў заклад, што.**

3. Слова *прадастаўляць* у беларускай літаратурнай мове няма, хоць пад уплывам рускай яго, здараецца, і ўжываюць. Аднак рабіць гэтага зусім не варта, бо для перадачы значэння рускага слова «предоставлять» у нас ёсць свае сродкі. Гэта і давацъ (магчымасць), і аддаваць (нешта ў нечае распараджэнне), і надаваць (права), і пакідаць (каго-небудзь на самога сябе), і выдзяляць (сродкі), і прапаноўваць (новы план работы начальству) і іншыя. А таму, спадарства, шукайма словы ў роднай мове, не пазычаючы іх там, дзе без гэтага можна абысціся.

## У абарону слоў

Ёсць у нашай мове слова брамнік (вартаўнік пры браме). Яно пазначаецца ў слоўніках як устарэлае. І яно патрэбнае перш за ўсё для аўтараў гістарычнай прозы. Напрыклад: *Брамнік з грукатам адчыніў перад возам браму* (У. Караткевіч).

А вось футбольнага гульца, які стаіць на варотах, лепш называць варатаром. Гэтае слова ўжываецца ў такім значэнні не першае дзесяцігоддзе. Яно пададзена яшчэ ў «Руска-беларускім слоўніку» (1953 год), ёсць у «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (1977—1984 гады). Ды і ня́даўні спецыялізаваны «Руска-беларускі слоўнік па фізічнай культуры і спорце» (2013 год) перакладае рускі тэрмін «вратарь» менавіта як «варатар», «запасной вратарь» — «запасны варатар» і гэтак далей

■ Далучайцеся!

# Новае жыццё ў абмен на... накрыўкі

## Дабрачынны праект набірае абароты ў нашай краіне

**У сталічным Батанічным садзе ў суботу, 25 чэрвеня, падчас акцыі «Першакласнае свята» можна ўзяць удзел і ў дабрачынным праекце «Новае жыццё ў абмен на накрыўкі».**
**Усё вельмі проста: вы збіраеце пластыкавыя накрыўкі, прыносіце іх валанцёрам праекта ў спецыяльную зону і за кожныя 10 штук атрымліваеце шчаслівы білет, які дазваляе выйграць прызы.**
**Чым болей накрывак, тым больш шанцаў выйграць.**

Праект «Новае жыццё ў абмен на накрыўкі» ў нашай краіне з'явіўся зусім нядаўна, у канцы мінулага года. Часам бацькі дзяцей з нервова-мышачнымі захворваннямі збіраюць грошы ў сацсетках. Ім патрэбныя каляскі, рэабілітацыя, апараты для дыхання і шмат чаго яшчэ. Разам з гэтым на беларускія сметнікі штогод трапляе 4000 тон пластыкавых накрывак. «Калі здаць іх на перапрацоўку, можна атрымаць не менш за 800 тысяч долараў», — лічыць **юрыст з Ліды Наталля КУНЦЭВІЧ.** Дзяўчына запусціла праект у Беларусі, каб збіраць пластыкавыя накрыўкі і дапамагаць хворым дзецям па ўсёй краіне хутчэй «закрываць» грашовыя зборы. Пачынала Наталля з ідэі, у якую мала хто верыў. Маўляў, ніхто не захоча збіраць накрыўкі асобна ад бутэлек. Сёння да праекта далучылася больш за сотню школ, прадпрыемстваў (у тым ліку Мілавіца, БМЗ, Беларуськалій, БелАЗ), банкаў і гіпермаркетаў у 50 гарадах і іншых населеных пунктах па ўсёй краіне.

— Я шукала ў інтэрнэце праект, які змог бы дапамагчы знаёмаму хлопчыку з дыягназам ДЦП, — расказвае **адна з каардынатараў праекта Юлія МОРХАТ.** — У сакавіку гэтага года я далучылася да праекта «Новае жыццё ў абмен на накрыўкі», распаўсюджвала інфармацыю ў школах, карэкцыйным цэнтры, магазінах, прадпрыемствах свайго горада — Глыбокага. Там устанавілі спецыяльныя кантэйнеры, і сёння мы сабралі больш за 150 кілаграмаў накрывак. А летам падчас форума «Тата, твой выхад» мы зарабілі сродкі для вырабу і ўстаноўкі першага ў краіне вулічнага кантэйнера.

Людзі прыносяць пластыкавыя накрыўкі ад звычайных бутэлек з-пад вады, ёгуртаў, малака, кавы, шампуняў, сланечнікавага алею — тое, што ёсць у кватэры ў кожнага. Калі сумняваецеся, падыходзіць накрыўка ці не, паглядзіце на яе ўнутраны бок. Там павінна быць маркіроўка 2, 4 ці 5. Ва ўстаноўлены дзень накрыўкі збіраюць і вывозяць на склад. Адтуль яны вялікай партыяй накіроўваюцца на завод пад Масквой. Перапрацоўчае прадпрыемства плаціць грошы за накрыўкі праекту (у Беларусі адна тона каштуе 200 долараў, у Расіі можна прадаць даражэй).

А далей «Новае жыццё ў абмен на накрыўкі» перавodзіць увесь прыбытак на рахунак падапечнага дзіцяці з захворваннямі нервовай сістэмы і касцей (у тым ліку з эпілепсіяй, ДЦП, пухлінамі і траўмамі галаўнога і спіннога мозга). Калі на рахунку збіраецца патрэбная сума, праект з дапамогай экспертнага савета медыкаў выбірае наступнага падапечнага.

За год працы праект плануе сабраць 240 тысяч долараў, якія накіруе на дапамогу цяжкахворым дзецям. Да канца года плануецца ўстанавіць 58 вялікіх і 10 сярэдніх кантэйнераў у буйных гандлёвых пунктах Мінска. А з верасня да праекта далучаецца 100 школ і дзіцячых садкоў у Маскоўскім раёне сталіцы.

Ідэя праекта «Новае жыццё ў абмен на накрыўкі» распаўсюджана ў 44 краінах свету. У Германіі 50 мільёнаў накрывак ператварыліся ў 100 тысяч вакцын ад поліяміеліту для дзяцей з Нігерыі. У Іспаніі — у мільён еўра на медыцынскае абсталяванне для 139 малых. Ва Украіне сабралі 21 тону на пратэзы для ветэранаў вайны. У Нідэрландах накрыўкі дапамагаюць будаваць навуковы цэнтр па даследаванні дзіцячай анкалогіі. У Аўстрыі «за накрыўкі» набываюць цацкі для дзяцей з малазабяспечаных сем'яў

■ Пад мікраскопам

# Аналізы раскажуць усё

## Якія тэсты трэба здаваць, каб праверыць сваё здароўе

**Ці трэба здароваму чалавеку здаваць аналізы? Якую лабараторыю (дзяржаўнай паліклінікі ці платнага медыцынскага цэнтра) пры гэтым выбраць? Чаму пацыенты нярэдка ігнаруюць патрабаванні да здачы аналізаў і якія памылкі мы робім, калі ідзём іх здаваць? Пра гэта расказала загадчык клініка-дыягнастычнай лабараторыі 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Наталля МАСКАЛЁВА.**



***— Наталля Васілеўна, навошта здароваму чалавеку здаваць аналізы?***

— Раз на год нікому не пашкодзіць здаць агульны клінічны аналіз, які ўключае агульны аналіз крыві, агульны аналіз мачы і кроў на глюкозу. Гэта варта рабіць для кантролю свайго здароўя. Калі з названымі аналізамі ў вас усё ў парадку, нейкі час можна не турбавацца, бо любое захворванне, у тым ліку і анкалагічнае, дасць змены ў паказчыках. Па многае можа расказаць узровень гемаглабіну ў агульным аналізе крыві. Калі ён паніжаны, гэта можа быць анемія і трэба шукаць яе прычыны, так праяўляць сябе можа, напрыклад, і анкалагічнае захворванне. Але ўбачыўшы ў аналізе паніжаны гемаглабін, не варта панікаваць. Яго ўзровень у многім залежыць ад узросту пацыента, яго анамнезу, таму толькі ўрач дае ўсе далейшыя тлумачэнні і прызначае пры неабходнасці дадатковыя абследаванні.

Павышаны паказчык узроўню лейкацытаў у агульным аналізе крыві можа сведчыць аб наяўнасці ў арганізме запаленчых працэсаў. Ацаніўшы яго ў сукупнасці з САЭ (скорасць асядання эрытрацытаў) і лейкацытарнай формулай, урач робіць выснову, які працэс праходзіць у нашым арганізме — вірусная ці бактэрыяльная інфекцыя.

Па агульным аналізе мачы мяркуюць найперш аб здароўі мочавыводзячай сістэмы. Каб выявіць узровень пашкоджання — ныркі гэта, мачавы пузыр, мачаточнік ці ўрэтра — у паліклініцы прызначаюцца розныя метады: агульны аналіз, аналіз мачы па Нічыпарэнку ці па Зімніцкім, трохшклянкавая проба. Гэта простыя і вельмі інфарматыўныя метады, і кіруючыся іх вынікамі разам з клінічнымі данымі можна ставіць дакладны дыягназ ці прызначаць дадатковае абследаванне, той жа бактэрыялагічны пасеў, які дазваляе выявіць узбуджальніка інфекцыі. Таму ігнараваць аналіз мачы не трэба.

Аналіз крыві на глюкозу, або, як кажуць, «на цукар», у першую чаргу дазваляе дыягнаставаць цукровы дыябет — біч сучаснага грамадства, які сёння паражае не толькі людзей сталых, але і маладых. Таксама ён дапамагае своечасова выявіць парушэнне глікеміі нашча і дае падставы ўрачу прызначыць прафілактычныя мерапрыемствы, якія дазволяць прадухіліць пераход яе ў цукровы дыябет. У такім выпадку, як правіла, рэкамендуюць змяненні ладу жыцця: рацыянальнае харчаванне, павелічэнне фізічнай актыўнасці для зніжэння вагі і іншае. Таму ўсім нам важна перыядычна здаваць аналіз крыві на цукар, і гэта проста неабходна людзям, якія маюць спадчынную схільнасць да цукровага дыябету.

***— Ці ёсць дадатковыя фактары рызыкі, з якімі мы павінны часцей здаваць тыя ці іншыя аналізы?***

— У рамках усеагульнай дыспансерызацыі ваш участковы ўрач у адпаведнасці з клінічнымі пратаколамі вызначае, якія абследаванні вам неабходныя. Калі вам больш за 40 гадоў, то трэба раз на два гады здаваць кал на схаваную кроў, агульны аналіз крыві, агульны аналіз мачы, аналіз крыві на глюкозу, біяхімічны аналіз крыві на шэраг паказчыкаў. Калі гэта малады чалавек, то аналізы прызначаюцца па медыцынскіх паказаннях.

***— Якія памылкі робяць пацыенты пры здачы аналізаў?***

— Найперш матэрыял для аналізу неабходна збіраць у аднаразовыя шкляныя ці пластыкавыя кантэйнеры, якія прадаюцца ў аптэках. Сёння некаторыя пацыенты прыносяць яго ў... поліэтыленавых пакетах, слоіках з-пад ёгурту ці крэму, нават не заўсёды памытых, запалкавых пачках. Вельмі важна, каб у слоіку не было пабочных рэчываў. Падчас аналізу выкарыстоўваюцца розныя хімічныя рэагенты, і яны ўступаюць у рэакцыю ў тым ліку і з рэчывамі, што знаходзяцца на сценках ёмістасці, — вынік атрымліваецца неаб'ектыўны. Калі мачу збіраюць у ёмістасць з-пад крэму ці ёгурту, там могуць прысутнічаць кроплі тлушчу і бактэрыі ў вялікай колькасці, што або ўвогуле не дазваляе правесці аналіз, або дае падставы меркаваць аб нейкай складанай паталогіі, якая патрабуе дадатковага абследавання і сур'ёзнай тэрапіі. Канешне, мы такія матэрыялы не прымаем і робім пазнаку: дэфект забору матэрыялу. Пацыенты павінны разумець: калі ёсць патрабаванні, іх трэба прытрымлівацца. Прычым яны ўніверсальныя і іх не так шмат: прыходзіць нашча, без фізічных нагрузак, не ўжываючы напярэдадні алкаголь, не курыць мінімум восем гадзін, матэрыял збіраць у сухі стэрыльны посуд.

***— На што ўплывае курэнне?***

— Яно павышае колькасць лейкацытаў і эрытрацытаў у крыві. А сапраўдны лейкацытоз можа сведчыць аб сур'ёзных захворваннях. Рост эрытрацытаў вядзе да павелічэння вязкасці крыві, што можа шкодзіць сілкаванню розных органаў.

***— Чаму перад здачай аналізу крыві на халестэрын нельга ўжываць тлустую ежу?***

— Ужыванне ежы прыводзіць да завышэння розных паказчыкаў, у тым ліку халестэрыну. Для вызначэння яго ўзроўню, а таксама некаторых іншых паказчыкаў біяхімічнага аналізу, выкарыстоўваюцца аптычныя прыборы, якія рэгіструюць пэўную мутнасць крыві. Пасля ўжывання тлустай ежы ў першыя некалькі гадзін наша кроў застаецца мутнай — да той пары, пакуль тлушчы не адправяцца на метабалізм. Таму і патрабуецца вытрымаць рэжым галадання, каб кроў ачысцілася і даныя аналізу былі аб'ектыўныя.

Патрабаванне: прыходзіць у лабараторыю не еўшы, часта ігнаруюць, між іншым, маладыя людзі, якім лабараторныя даследаванні прызначаны па агульным захворванні ці для прафагляду, каб атрымаць допуск да працы. Гэта мы бачым па высокім узроўні глюкозы. Такія пацыенты здаюць аналізы «для ўрача», а не для ацэнкі стану ўласнага здароўя. Усе патрабаванні для здачы аналізаў, дарэчы, можна знайсці на сайтах паліклінік. Хацелася б, каб пацыенты іх чыталі і выконвалі.

***— Ці варта самастойна расшыфроўваць вынікі сваіх аналізаў? Зараз у інтэрнэце таксама дастаткова інфармацыі на гэтую тэму...***

— Сапраўды, пацыенты часта патрабуюць у нас свае вынікі, але паводле закона, інтэрпрэтуе і паведамляе вынік толькі лечачы ўрач, які ведае стан здароўя пацыента, яго ўзрост і іншае. Ён мае дастатковую кампетэнцыю, каб супаставіць даныя і растлумачыць той ці іншы вынік. Таму не варта самому імкнуцца іх расшыфраваць.

***— Чаму вынікі аналізаў могуць адрозніваццa ў дзяржаўнай паліклініцы і платным цэнтры?***

— Часам менавіта па названай прычыне: першапачаткова пацыент не рыхтуецца да аналізу або няправільна збірае матэрыял і, незадаволены вынікам у паліклініцы, ідзе ў платны цэнтр, дзе здае аналіз паўторна, больш пільна ставячыся да падрыхтоўкі.

***— Насамрэч наколькі важна, дзе здаваць аналіз: у паліклініцы ці платнай лабараторыі?***

— Лічу, што вялікай розніцы няма, адзінае — хуткасць выканання даследавання. Агульны аналіз крыві і мачы можна здаваць у любой дзяржаўнай паліклініцы. Ва ўсіх ёсць неабходныя матэрыялы і абсталяванне, праводзіцца кантроль якасці кожнага даследавання. Не варта скептычна ставіцца і да варыянта, калі аналіз выконваецца ручнымі методыкамі. На сёння аўтаматызацыя не можа цалкам замяніць ручныя метады, напрыклад мікраскапію

Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.



# Мы разам — Беларусь!



Краіна моцная рэгіёнамі: Салігорскі раён, г. Салігорск

# Новая паліклініка, гасцініца і скульптура заступніцы шахцёраў

## Якія яшчэ падарункі чакаюць салігарчан да юбілею горада

**25 жніўня аднаму з самых маладых гарадоў Беларусі — Салігорску — спаўняецца 60 гадоў. Тут актыўна рыхтуюцца да юбілею. Добраўпарадкоўваюцца дваровыя тэрыторыі, скверы і паркі, уладкоўваюцца вуліцы, тратуары, будуюцца новыя аб'екты. Як горад сустрэне свята, расказаў «Звяздзе» старшыня райвыканкама Алег ПАСКРОБКА.**



— Калі казаць у цэлым, то ў раёне і горадзе задумана ажыццявіць сто пятнаццаць разнастайных праектаў. Шмат якія з іх ужо рэалізаваныя. Да юбілею і Дня горада, напрыклад, закончым будаўніцтва паліклінікі. Узвялі яе за дзесяць месяцаў. Такога выніку дазволіў дасягнуць той задзел, які зрабілі заранеей, яшчэ ў кастрычніку мінулага года.

Цяпер на базе цэнтральнай раённай бальніцы адкрыты занальны цэнтр, які будзе аказваць спецыялізаваную медыцынскую дапамогу жыхарам не толькі горада, але і суседніх раёнаў. Салігорск расце, развіваецца, з'яўляюцца новыя жылыя забудовы. Новая ўстанова ахову здароўя забяспечыць якаснае абслугоўванне 18-га, 19-га, 21-га і 22-га мікрараёнаў. У нас была праблема са стаматалогіяй. Цяпер у аддзяленні з'явіцца сучаснае абсталяванне, якое дазволіць аказваць больш дасканалыя паслугі. Напрыклад, зрабіць 3D-пантаграфію, мамограф дапаможа своечасова распазнаць анкалогію малочнай залозы ў жанчын. Упершыню адкрыецца кансультацыйнае аддзяленне. Магутнасці паліклінікі — 400 наведванняў у змену.

Актыўна будуецца 21-ы мікрараён: пракладваем сеткі, інжынерныя камунікацыі, прыступілі да ўзвядзення першага жылога дома. Праектуецца ўладкаванне набярэжнай вадасховішча. Тут запланаваныя скейт-парк, дзіцячы парк. Наогул жа неабходна цалкам адкрыць для гараджан водную гладзь, каб яны маглі прагуляцца на скутарах, яхтах, катамаранах. На павестцы дня — уладкаванне партовай часткі, стварэнне годнай інфраструктуры. Мы звярнуліся ў адну з брэсцкіх вышэйшых навучальных устаноў з просьбай да будучых архітэктараў прыняць удзел у конкурсе на самае лепшае эскізнае рашэнне. Вызначылі прызавы фонд: 1000 рублёў за першае месца, за другое і трэцяе — па 500 рублёў. Толькі на добраўпарадкаванне берагоў вадасховішча неабходна восем мільёнаў рублёў без уліку розных культурных, забаўляльных аб'ектаў.

У развіццё горада значны ўклад уносіць «Беларуськалій». Са звычайнага інтэрната зрабіў шматкватэрны жылы дом калідорнага тыпу з уладкаванымі балконамі, больш высокай якасцю пражывання. Ідзе рэканструкцыя гасцініцы. Яна ў большай ступені разлічана на турыстаў. Але тыя, хто прыязджае да нас, павінны бачыць нашу гасціннасць, жыць у камфортных умовах.

***— Алег Рыгоравіч, на вашу думку, чаго не хапае гораду?***

— Мы кажам, што Салігорск — горад для жыцця, працы, адпачынку і рэалізацыі нейкіх дасягненняў. Нашым гараджанам не хапае спартыўных аб'ектаў, веладарожак, лыжаролерных трас, скейт-парка. Мабыць, у першую чаргу на набярэжнай. Мы над гэтым момантам працуем: праекціроўшчыкі прыступілі да работы. На жаль, ёсць пытанні па фінансаванні, але спадзяюся, што падтрымаюць мясцовыя прадпрыемствы. Гораду неабходныя дзіцячы



парк, зала для заняткаў актыўнымі відамі спорту. Валейбольная каманда «Шахцёр» заняла першае месца ў чэмпіянаце краіны. А залы, дзе можна было б прымаць чэмпіянат міжнароднага ўзроўню, у нас няма. Такія памяшканні павінны быць разлічаны на дзве тысячы месцаў. Стадыёны «Шахцёр» і «Будаўнік» таксама не адпавядаюць патрабаванням міжнародных гульняў. Нядрэнна было б пабудаваць амфітэатр на набярэжнай.

***— Які турыстычны патэнцыял у Салігоршчыны, чым рэгіён можа здзівіць заможнага госця?***

— Салігоршчына пачынаецца ад Капыльскай грады і цягнецца да Палесся.

Тут можна ўбачыць цікавыя прыродныя зоны: лес, тарфянікі, балоты. Красная Слабада зачароўвае сваімі азёрамі. Дастаткова ў нас аграсядзіб, аб'ектаў для палявання, рыбалкі. Нашы тэрыконы, як мы жартуем, гэта — малыя горы Беларусі. Карыстаецца папулярнасцю ў турыстаў лячэнне ў саляных пячорах, так званае спелеалячэнне.

Салігорск — горад даволі малады. Так, у нас няма старажытных палацаў, замкаў, манументальных гістарычных збудаванняў. Але паглядзець ёсць што. Памятнікі шахцёрам, Героям Савецкага Саюза Васілю Каржу і Васілю Казлову, а таксама — першы камень, які быў закладзены ў гонар заснавання горада. Архітэктурныя славутасці — Свята-Пакроўскі храм у вёсцы Чыжэвічы, каталіцкі касцёл Святога Францыска, самы вялікі ў Мінскай вобласці комплекс праваслаўнага кафедральнага сабора Раства Хрыстовага.

Госці могуць прагуляцца па «Сцежцы здароўя», якая праходзіць праз лес у мяжы горада, наведаць лядовы палац.

***— У горадзе з'явіцца скульптура святой велікамучаніцы Варвары. Чым яна знакавая для салігарчан?***

— Па паданні велікамучаніца Варвара жыла ў Сірыі ў пачатку IV стагоддзя. Яна з'яўляецца заступніцай скалалазаў і гарнякоў. У Салігорску святую шануюць як заступніцу шахцёраў. Салігорск — малады горназдабывальны рэгіён. Большасць жыхароў працуюць на «Беларуськаліі». Праца на рудніках, пад зямлёй складаная і небяспечная. І святая Варвара стане своеасаблівым абярэгам і памочніцай у іх нялёгкай справе, свецкім сімвалам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## Пазнай свой горад

# Культурны код Салігорска

**Летась Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка заняла першае месца ў рэспубліканскім конкурсе «Найлепшая бібліятэка года». Ва ўстанове, што ўзначальвае Людміла Муравейка, працуе калектыў, які знаходзіцца ў пастаянным творчым пошуку.**



**Галоўны бібліёграф Надзея ЗАСІНЕЦ растлумачыць, як зрабіць першы ход у «фірменнай» бібліятэчнай гульні эрудытаў.**

Напрыклад, у Год культуры і да юбілею горада тут стартаваў унікальны інфармацыйна-адукацыйны праект «Культурны код Салігорска» па даследаванні гарадскога асяроддзя і пошуку асаблівасцяў шахцёрскай сталіцы. Ён рэалізуецца сумесна з Салігорскім дзяржаўным каледжам. Ініцыятар і каардынатар праекта — бібліятэкар першай катэгорыі Кацярына Вавілава і педагог каледжа Алена Смоліч.

Добра гарадам з тысячагадовай гісторыяй, ім ёсць што расказаць і паказаць. Салігорск — горад малады, днямі яму спаўняецца 60 гадоў. Але і тут ёсць шмат цікавых і адметных мясцін. І каму, як не моладзі, расказаць аб культурнай і прыроднай спадчыне сваёй малой радзімы? Для навучэнцаў каледжа арганізавалі курсы-трэнінгі, сярод іх было праведзена сацыялагічнае даследаванне «Любіць свой горад вельмі проста», каб выявіць, наколькі моладзь ведае свой Салігорск. Вынікі паказалі, што веды недастатковыя. У сувязі з гэтым Кацярына Вавілава распрацавала курс краязнаўчых заняткаў, улічыўшы тое, што ў маладзёжным асяроддзі прыярытэтным у арганізацыі вольнага часу з'яўляецца выкарыстанне сучасных сродкаў камунікацый, камп'ютарных тэхналогій, інтэрнэт-прастораў. Навучэнцы прынялі ўдзел у трэнінгу «Раскадзіруй горад разам з намі», на практычным уроку на іх смартфоны была ўстаноўлена праграма счытвання QR-кодаў. Затым ім прапанавалі



**Бібліятэкар першай катэгорыі Кацярына ВАВІЛАВА.**

стаць «культурнымі навігатарамі», на валанцёрскіх пачатках знаёміць жыхароў горада і гасцей з аб'ектамі прыроднай, культурнай спадчыны. Пад кіраўніцтвам куратараў валанцёры аб'ядналі гістарычныя, культурныя, прыродныя славутасці Салігорска ў некалькі экскурсійных пешаходных маршрутаў.

Першы з іх — «ДРЭВАград», знаёміць усіх ахвотных з нетыповымі для гарадскога азелянення дрэвамі, што растуць у Салігорску. Другі — «Самая Соль Салігорска» — з архітэктурнымі і гістарычнымі помнікамі горада. Трэці маршрут — «Шлях да Валошкавага Храма» пралягае па вуліцах, дзе знаходзяцца першыя забудовы Салігорска. Канцавы пункт маршруту — Свята-Пакроўская царква ў вёсцы Чыжэвічы.

Цяпер ажыццяўляецца трэці этап праекта. У межах яго прайшлі экскурсія «Завод, які пабудаваў горад», духоўная экспедыцыя «І расквітнеў Храм Валошкаў...», час памяці «Запішы нас у гісторыю гаротнай быллю...»

За 2016 год арганізатарамі навучання і падрыхтаваныя 26 студэнтаў-валанцёраў, якія правялі восем экскурсій для розных груп насельніцтва. У 2017-м было атрымана 11 заявак на экскурсіі.

Праект стаў сучасным, інфармацыйным і прыцягальным для маладых людзей дзякуючы менавіта тэхналогіі QR-кода. З дапамогай мабільнага тэлефона коды счытваюцца з інфармацыйнай таблічкі, і любы турыст, жыхар горада можа перайсці на сайт бібліятэкі ў спецыяльны раздзел, дзе сабраныя ўсе звесткі аб праекце: схема маршруту, інфармацыя пра аб'екты. Колькасць віртуальных наведванняў ужо склала 7358. Створана таксама старонка ў сацыяльных сетках.

Праект прынёс карысць і аддачу для ўсіх. Для горада маршруты прэтэндуюць стаць турыстычнымі асаблівасцямі, бібліятэка ў чарговы раз пацвердзіла «званне» інфармацыйна-культурнага, асветніцкага цэнтра. Ну а моладзь даведалася шмат цікавага з гісторыі Салігорска, аб яго адметных мясцінах і славутых земляках і стала яшчэ больш ганарыцца шахцёрскай сталіцай.

### МУЗЕЙ ДЛЯ ЛЯЛЕК

**Шмат цікавага і карыснага ладзіцца для маленькіх наведвальнікаў і ў Салігорскай раённай дзіцячай бібліятэцы.**

— З 1989 года на яе базе працуе тэатральны клуб «Забава», — расказала **бібліятэкар чытальнай залы Наталля БАБІЧ.** — Усіх лялек работнікі робяць самі з падручных матэрыялаў, шыюць іх адзенне. За амаль што трыццаць гадоў іх сабралася шмат, таму казачных персанажаў «пасялілі» ў асобным пакоі — маляўніча аформленым музеі.



**У адным з пакояў бібліятэкі прапісаліся лялькі — героі любімых казак.**

Маленькія наведвальнікі ахвотна сюды прыходзяць, бо любімых герояў казак, мультфільмаў можна ўзяць у рукі, пагуляць з імі. Карыстаюцца папулярнасцю ў дзяцей і спектаклі, якія ладзяць для іх работнікі бібліятэкі. Яны самі пішуць сцэнарыі, рыхтуюць дэкарацыі, запрашаюць на прагляд хлопчыкаў і дзяўчатак з садкоў, вучняў малодшых класаў. Самадзейныя артысты выязджаюць таксама з пастаноўкамі ў дзіцячыя навучальныя ўстановы, летнія аздараўленчыя лагеры, санаторыі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### ЗА ПАРУ КРОКАЎ АД «ЗАЛАТОЙ» ДАТЫ

Палац культуры рыхтуецца да паўвекавога юбілею

Каб цудоўных эмоцый хапіла кожнаму, дзеячы культуры Салігорска вырашылі не абмяжоўвацца адной вялікай урачыстасцю, а распачаць цэлы шэраг мерапрыемстваў. Сёння ўстанова налічвае 23 творчыя калектывы, так што відовішчаў для гараджан павінна хапіць на цэлы год.

— Усе калектывы аб'яднаны творчымі праектамі. Кожная ўзнагарода нашых артыстаў метафарычна набліжае святочную дату. Мы спадзяёмся, што гэтым разам нашы гледачы змогуць «зазірнуць за кулісы» і па-іншаму ацаніць працу культурнага работніка, — прыадкрыла інтрыгу **дырэктар Палаца культуры Аксана КУКЛІЦКАЯ.**

Пра новае бачанне згадана не здарма. Ужо дзесяць гадоў, як у Палацы дзейнічае народны тэатр. Гэтым разам яго ўдзельнікі рыхтуюць асаблівы юбілейны спектакль. Малады і крэатыўны рэжысёр Аляксандр Барадка абяцае паказаць унутранае жыццё ўстановы культуры і запрасіць чытача ў творчую прастору артыстаў. У нечым падобныя і адначасова адрозныя рысы мае праект пад кіраўніцтвам Галіны Каракі, кіраўніка тэатра музыкі і паэзіі «Сугучча» і куратара аб'яднання творчых людзей «Лабірынт». Паэты, музыкі, выканаўцы песень прапанавалі правесці сярод ветэранаў і цяперашніх работнікаў культуры марафон «Асабіста датычны». На эмблеме мерапрыемства — працоўная кніжка з пячаткай Палаца культуры і паметкаю «Службовы ўваход». Яскравы намёк на шчырасць, якую, як вядома, не заўсёды атрымаеш на ўваходзе «парадным».

***(Заканчэнне на 10-й стар.)***

# Ёсць хлеб, будзе і песня

### Чым парадуюць салігорскія хлебапёкі землякоў і гасцей да юбілею шахцёрскай сталіцы



Да свята хлебапёкі падрыхтавалі новыя віды ўпрыгожанай салодкай прадукцыі.

Калі праходзіш па праспекце Міру ў Салігорску, то галаву кружыць пах свежавыпечанага хлеба. Менавіта тут непадалёку адзін ад аднаго знаходзяцца філіял «Салігорскі хлебазавод» адкрытага акцыянернага таварыства «Барысаўхлебпрам», які ўзначальвае **Васіль ПЕНЯЗЬ,** побач з філіялам — фірмовы магазін «Водар хлеба», які мясцовыя жыхары называюць «Каравай», дзе шырока прадстаўлена прадукцыя прадпрыемства. На заводзе працуюць хлебабулачны і кандытарскі цэхі. Тут выпускаюць каля сарака найменняў хлебабулачных і каля 50 найменняў кандытарскіх вырабаў. Пекарам і кандытарам ёсць чым ганарыцца. Многія вырабы карыстаюцца звышпапулярнасцю ў спажыўцоў. Гэта багет «Салігорскі», пячэнне аўсянае з водарам топленага малака, пернікі «Дудзінкаўскія» новыя, ласункі мучныя «Амерыканер» з вотруб'ем, разнастайныя пірожныя, слоеныя вырабы, хлеб «Марачанскі» духмяны, хлеб «Сёмушка». Сапраўдным брэндам горада стаў хлеб «Шахцёрскі» апетытны.

З пачатку гэтага года салігорскія хлебапёкі здзівілі гараджан новай прадукцыяй — хлебам «Хутарок» зерневым абедзенным, які складаецца з мукі пшанічнай і варанага зерня пшаніцы, а зверху апетытная хрумсткая скарынка пасыпана аўсянымі шматкамі. Хлеб «Жыцькаўскі зерневы», у склад якога ўваходзіць акрамя пшанічнай мукі 67 % прарошчанага зерня. Гэты хлеб ацанілі прыхільнікі здаровага ладу жыцця. Цэльнае прарошчанае зерне змяшчае харчовыя валокны, што зніжаюць узровень халестэрыну ў арганізме, ачышчаюць стрававальны тракт, умацоўваюць сасуды галаўнога мозга. Ласункі мучныя «Вечарынка з павідлам» і «Слабодскія з макам» прыйшліся даспадобы тым, хто любіць салодкае.

На працягу некалькіх гадоў спажыўцы надта захапіліся рознымі моднымі дыетамі, якія не самым лепшым чынам уплываюць на здароўе. Як раяць спецыялісты, чалавек павінен ужываць штодзень адну-дзве лусты хлеба. У ім змяшчаюцца пажыўныя рэчывы, вітаміны, мікраэлементы, якіх няма ў іншых прадуктах харчавання.



Цеставоды Людміла ГАНЧАР і Вольга КАСЬКО, пекар Ганна ШКОДА.

Асабліва калі хлеб вырабляецца з натуральных інгрэдыентаў, па даўнішняй праверанай тэхналогіі. Не сакрэт, што сёння вытворцы карыстаюцца рознымі хітрасцямі, дабаўкамі для таго, каб прадоўжыць тэрмін захоўвання прадукцыі на працягу некалькіх сутак, а то і месяцаў. Натуральныя прадукты не могуць столькі часу не чарсцвець і не псавацца.



Высокапрадукцыйнае аўтаматызаванае абсталяванне — адметная рыса хлебапякарнай вытворчасці.

— Мы прыхільнікі традыцыйных метадаў хлебапячэння. Адрозненне нашай гандлёвай маркі ў багацці рэцэптуры, выкарыстанні карысных дабавак, вітамінаў і мікраэлементаў, натуральных інгрэдыентаў, адсутнасці кансервантаў, — сцвярджае **начальнік вытворчасці хлебазавода Наталля ДАВЫДАВА.** — Гэтыя вырабы прыцягваюць людзей, якія звяртаюць увагу на правільнае і здаровае харчаванне, без лішніх тлушчаў і вугляводаў.

На заводзе можна заказаць торт на розныя ўрачыстасці: радзіны, хрэсьбіны дзіцяці, вяселле, дзень нараджэння, на карпаратыўную вечарынку. Над імі чаруе спецыяльна навучаны чалавек, які валодае не толькі прафесійным майстэрствам, але і выдумкай, фантазіяй, як сапраўдны мастак, з-пад яго рук выходзяць шэдэўры.

Салігорскія пекары і кандытары штогод удзельнічаюць у рэспубліканскім конкурсе «Смаката» і заўсёды паказваюць дастойныя вынікі. А Лізавета Сініца ў намінацыі «Вясельны торт» заняла першае месца.

У лютым прадпрыемства купіла адмысловы прынтар і пачало з яго дапамогай выпускаць аздобленую рознымі малюнкамі прадукцыю. Спажывец можа заказаць не толькі торт з любой ядомай карцінкай з харчовых фарбавальнікаў. Майстры па жаданні заказчыка могуць нанесці на паверхню вырабу яго асабістую фатаграфію, фатаздымкі блізкіх, сваякоў.

Да свята горада і 60-годдзя шахцёрскай сталіцы завод парадуе гараджан і гасцей новымі арыгінальнымі вырабамі. Пернік «Салігорскі сувенір» у прыгожай каробцы з гербам Салігорска на адным баку і цікавай інфармацыяй аб горадзе на адваротным. Вага вырабу паўкілаграма. Упэўнена, прыйдуцца даспадобы і невялікія пернікі з рознымі выявамі казачных персанажаў, герояў папулярных мультфільмаў, эмблемай горада. З'явяцца яны ў продажы напярэдадні Дня горада. Акрамя таго, на свяце будзе прысутнічаць кандытарская кампазіцыя, якую прыгатуюць кандытары завода.

Васіль Пеняз шмат увагі ўдзяляе падбору кваліфікаваных спецыялістаў, мадэрнізацыі вытворчасці, укараненню сучасных тэхналогій, закупцы новага абсталявання.

У прыватнасці, нядаўна на заводзе ўстаноўлена новая чэшская лінія па вытворчасці подавага хлеба. Работніцы не могуць нарадавацца. Ручная праца тут зведзена практычна да нуля, усе працэсы аўтаматызаваныя, аўтаматыка рэгулюе вільготнасць, тэмпературу. Цяпер новае абсталяванне праходзіць апрабацыю, адпрацоўваецца ўвесь тэхналагічны працэс. Да юбілею горада яно запрацуе на поўную магутнасць. А гэта значыць, павялічыцца і прадукцыйнасць працы. Зрэшты, не так даўно тут закупілі і расійскую лінію для выпуску фармавога хлеба. Такога абсталявання няма ні на адным беларускім заводзе. І як сцвярджаюць пакупнікі, хлеб на ім атрымліваецца адмысловай якасці.

У далейшых планах — шмат задум. Але раскрываць сакрэты прадпрыемства пакуль рана.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 600142719

# КОЖНЫ ДЗЕНЬ НА СТАЛЕ

**Малако і кефір, масла і тварог пастаянна на хвалі попыту. Такія прадукты ёсць бадай што ў любым доме. Сярод вытворцаў — Салігорскі філіял ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» — прадпрыемства, якое ўзначальвае Ігар РАКЧЭЕЎ, — можа і не самы буйны, аднак здольны вытрымліваць усе высокія патрабаванні да якасці. А яркую ўпакоўку, распрацаваную мясцовымі дызайнерамі, ужо ацанілі спажыўцы ў сталічных крамах.**

Сёння з 12 гаспадарак Салігорскага раёна на прадпрыемства паступае каля 250 тон малака. Завод спецыялізуецца на выпуску самай запатрабаванай малочнай прадукцыі — малака, смятаны, кефіру, тварагу і тваражных вырабаў, сметанковага масла і дэсертаў.

Цяперашні асартымент прадукцыі складае 66 найменняў. Пералік непастаянны, ён увесь час змяняецца — гэтак жа, як пераменьваюцца густы спажыўцоў. У тым і сакрэт удалай канкурэнцы — своечасова зразумець запыты рынку, каб прапанаваць пакупніку якасны і смачны прадукт. Так, зусім нядаўна салігарчане пачалі выраб дэсертнай тваражнай прадукцыі з вішнёвым і чарнічным напаўняльнікамі.

У 2016 годзе работнікі філіяла асвоілі новую лінію вытворчасці ультрапастэрызаванага малака. Новае абсталяванне дазваляе выпускаць прадукт з захаваннем усіх карысных рэчываў сапраўднага малака і пры гэтым павялічыць тэрмін яго прыдатнасці да шасці месяцаў. Поўнасцю заменена абсталяванне ў апаратным цэху, што дапамагае павялічыць якасць вырабаў. Асабівы акцэнт зроблены на лінію вытворчасці тварагу, на якую сёння ідзе каля 40 працэнтаў сыравіны. У 2008 годзе завод набыў новую аўтаматычную лінію для вырабу тварагу і мяккіх сыроў.

Спецыяльна для людзей з лактазнай недастатковасцю на прадпрыемстве запушчана вытворчасць малака без лактозы. Спецыяльная тэхналогія дазваляе знізіць колькасць малочнага цукру да 0,01 працэнта, такім чынам кожны можа ацаніць смак салігорскага прысмака.



Апаратчык пастэрызацыі Алена ЖЭЛТАГІРКА за ультрапастэрызацыйнай устаноўкай.





Малако дастаткова «капрызны» прадукт. Кантроль якасці на заводзе пачынае працаваць, як толькі цыстэрна сыравіны прыбывае ад пастаўшчыка, і прысутнічае на ўсіх этапах вытворчасці. З кожным разам патрабаванні да прадукцыі становяцца ўсё больш жорсткія, а калі на месцы немагчыма адсачыць некаторыя параметры, прадпрыемства адпраўляе пробы ў рэспубліканскія лабараторыі. Вытрымаць стандарты якасці тым больш важна, што гатовы прадукт паступае не толькі на беларускі рынак. Адным з самых галоўных пакупнікоў салігорскіх прадуктаў за межамі краіны стала Расія, асвойваюцца рынкі ў Казахстане і Кітаі.

**Намеснік дырэктара Святлана ТУРБАН** звяртае ўвагу на яшчэ адно новаўвядзенне:

— Сёлета мы заканчваем рэканструкцыю аміячна-кампрэсарнага цэха. Гэта вялікі праект, які паўплывае на далейшую работу прадпрыемства. Справа ў тым, што холаданосьбітам на заводзе з'яўляецца аміяк — даволі небяспечнае хімічнае злучэнне. Клапоцячыся пра бяспеку работнікаў і жыхароў горада, мы пераходзім на скарочанае выкарыстанне гэтага рэчыва. Новая ўстаноўка дазволіць скараціць выкарыстанне холадагенту з трох тон да 350 кілаграмаў. Такім чынам мы паменшым наяўнасць аміяку ў сістэме амаль у 10 разоў.

Прадукцыя Салігорскага філіяла выпускаецца пад брэндам «COMPLIMILK» ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат».

— Наша прадукцыя — гэта тое, што кожны дзень прысутнічае на стале. Значыць, трэба аднолькава клапаціцца пра смак, бяспечнасць і прывабны выгляд, — лічыць Святлана Турбан.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

УНП 600119098.

# 10 ГАДОЎ — ДА САМЫХ СМЕЛЫХ ВЯРШЫНЬ





## Сёлета спартыўна-відовішчны комплекс у Салігорску святкуе юбілей.



Пакатацца на каньках, наведаць саўну ці паглядзець канцэрт — калі жыхары шахцёрскай сталіцы Беларусі захочуць цікавага і актыўнага адпачынку, яны ведаюць, дзе яго шукаць.

Адкрыты ў 2008-м да 50-годдзя горада комплекс і сёння застаецца надзвычай папулярным. Толькі за апошнія сем месяцаў тут пабывала 129 тысяч наведвальнікаў, што на пяць працэнтаў больш, чым летась. Для параўнання: агульная колькасць жыхароў у Салігорску складае 106 тысяч чалавек.

Установа вядзе шматбаковую работу для папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, здаровага ладу жыцця і актыўнага адпачынку. Для паслуг наведвальнікаў адкрыты лядовая арэна, спартыўны, харэаграфічны і трэнажорны залы, саўна, хамам, спартыўны магазін і кафэ.

Пад кіраўніцтвам прафесійных інструктараў тут праводзіцца 165 відаў платных паслуг. Найбольш папулярныя — гэта масавае катанне на каньках, заняткі ў трэнажорнай зале, фітнес-аэробіка, ёга, фітнес-мікс, дзіцячы фітнес, а таксама саўна і хамам. Таксама тут базуецца хакейны клуб «Шахцёр Салігорск» з дзвюма прафесійнымі камандамі і дзіцяча-юнацкім аддзяленнем па хакеі з шайбай.

Аматары яркіх спартыўных відовішчаў могуць сачыць з трыбун за самымі цікавымі спаборніцтвамі: у комплексе на высокім узроўні праводзяцца матчы адкрытага чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па хакеі з шайбай у экстралізе з удзелам каманды «Шахцёр Салігорск», найвышэйшай лізе з удзелам каманды «Шахцёр-2»; міжнародныя матчы нацыянальнай зборнай Беларусі па хакеі, дзіцяча-юнацкая баскетбольная, валейбольная, гандбольная лігі, міжнародныя і рэспубліканскія турніры. Прадугледжаны момант, калі на лядовую пляцоўку ўстанаўліваюць сцэну. Такім чынам перад жыхарамі і гасцямі горада праводзяцца канцэрты вядомых выканаўцаў, цыркавыя і тэатральныя прадстаўленні. А бывае, што тэрыторыя комплексу ператвараецца ў выстаўку-кірмаш ці месца для экскурсіі.

Расказваючы пра спартыўную ўстанову, нельга прамінуць створаную на яе базе дзяржаўную ўстанову «Салігорская раённая дзіцяча-юнацкая спартыўная школа па гульнявых відах спорту «Шахцёр». Зараз тут займаецца 722 навучэнцы пад наглядам 18 прафесійных трэнераў. Нягледзячы на тое, што школа дастаткова маладая, яе выхаванцы ўжо гатовыя паказаць высокія вынікі. Толькі ў 2018 вучні ДЮСШ сталі пераможцамі дзіцяча-юнацкай баскетбольнай лігі сярод дзяўчат (трэнер-выкладчык Таццяна Мартынчук) і дзіцяча-юнацкай валейбольнай лігі сярод юнакоў (трэнер-выкладчык Юрый Дудко).



Адкрыць для сябе дарогу ў вялікі спорт могуць не толькі гаражане. Салігорская раённая ДЮСШ па гульнявых відах спорту «Шахцёр» мае аддзяленні ў аграгарадку Доўгае і гарадскім пасёлку Старобін.

Школа на бясплатнай аснове набірае спартыўна адораных дзяцей і на ўвесь час навучання забяспечвае іх усім неабходным для заняткаў рэквізітам — ад формы да мячоў.

***Віншуючы з 60-гадовым юбілеем родны Салігорск і яго жыхароў, хачу пажадаць любімаму гораду росквіту і гасціннасці, дабрабыту і шчасця, новых спартыўных і творчых перамог!***

**Дырэктар спартыўна-відовішчнага комплексу Ігар ВЫСКВАРКА.**

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

УНП 690520659.

# Крочыць у нагу з часам і нават крыху наперадзе

**Менавіта так працуе камунальнае нарыхтоўчае ўнітарнае прадпрыемства «ЭкаКомплекс».**

«Многія чытачы ўяўляюць, што прадпрыемства, якое займаецца сарціроўкай цвёрдых камунальных адходаў, не можа падтрымліваць санітарны стан на сваёй тэрыторыі. Гэта проста немагчыма ў сілу спецыфікі. Шчыра прызнацца, так думала і я. А калі наведала камунальнае нарыхтоўчае ўнітарнае прадпрыемства «ЭкаКомплекс» у Салігорску, мае погляды кардынальна перамяніліся. Тэрыторыя ў ідэальным стане, заасфальтаваная, агароджа пафарбаваная, а мяшкі з адходамі акуратна складзеныя. Гэта сучаснае прадпрыемства, якое паспяхова працуе, укараняе новыя метады, формы работы, крочыць у нагу з часам, укладвае сродкі ў мадэрнізацыю матэрыяльна-тэхнічнай базы. Тут мэтанакіравана і паступальна рухаюцца наперад, паляпшаюць год ад году вынікі эканамічнай дзейнасці. А гэта залог матэрыяльнага дабрабыту работнікаў, дастойная заработная плата.

— Наша прадпрыемства створана ў 2004 годзе і зарэгістравана ў 2007-м як самастойная юрыдычная структура, якая стала называцца «Камунальнае нарыхтоўчае ўнітарнае прадпрыемства «ЭкаКомплекс», — расказаў **выконваючы абавязкі дырэктара Валерый ЕРМАКОВІЧ**. — Найперш мы ставім перад сабой задачы па зніжэнні ўздзеяння цвёрдых камунальных адходаў на навакольнае асяроддзе. Нам неабходна як мага больш дастаць другасных матэрыяльных рэсурсаў для перапрацоўкі: пластык, папера, шкло. Мы таксама аказваем паслугі насельніцтву, іншым спажыўцам па абыходжанні з гэтымі адходамі, збіраем, нарыхтоўваем і рэалізуем другасныя матэрыяльныя рэсурсы (ДМР).

У Салігорскім раёне прадстаўлены тры асноўныя сістэмы іх збору. Кантэйнерная ўяўляе сабой раздзельны збор у месцах, дзе яны назапашваюцца. Акрамя таго, нарыхтоўка вядзецца на стацыянарных і перасоўных прыёмных пунктах, а таксама — з дапамогай тэхналагічнай сарціровачнай лініі. Раздзельным зборам адходаў ахоплена 100 % населеных пунктаў раёна і Салігорск.



— Такі вялізны пластыкавы корпус з'яўляецца асновай канструкцыі заглыбленай смецніцы, — гаворыць выконваючы абавязкі дырэктара «ЭкаКомплексу» Валерый ЕРМАКОВІЧ.

У Салігорску вельмі шчыльная забудова. Уладкаваць кантэйнерныя пляцоўкі бывае даволі складана. Але на прадпрыемстве знайшлі выхад: устанавілі на ўнутраных дваравых тэрыторыях горада кантэйнеры заглыбленага тыпу аб'ёмам пяць метраў кубічных, якія займаюць мала месца і больш умяшчальныя, чым звычайныя кантэйнеры. Гэтае ўдалае рашэнне дазволіла абсталяваць больш пляцовак для раздзельнага збору адходаў. Цяпер на тэрыторыі горада і раёна ўстаноўлена 1500 кантэйнераў для гэтых мэт, ужо ўладкавана 20 заглыбленых. Па праграме «Камфортнае жыллё» апаратар выдзяляе прадпрыемству сродкі для закупкі яшчэ 30 кантэйнераў такога тыпу і смеццявоза для іх вывазу. Яшчэ тры кантэйнеры прадпрыемства купляе за свае грошы.

— Мы набылі спецыяльны аўтамабіль, які забірае адходы па ўстаноўленым маршруце і графіку. Механічная праца тут зведзена практычна да нуля, усе працэсы аўтаматызаваныя, — кажа Валерый Уладзіміравіч. У мікрараёне «Памесце» Салігорска прадпрыемства «ЭкаКомплекс» укараніла яшчэ адзін цікавы спосаб збору ДМР па сістэме, якая распаўсюджана ў Галандыі. За асабістыя сродкі закупіла поліэтыленавыя мяшкі рознага колеру для раздзельнага збору адходаў: жоўтага — для пластыку, зялёнага — для паперы і кардону, сіняга — для шкла, і раздало па два камплекты ўладальнікам дамоў. Вываз ажыццяўляецца па ўстаноўленым графіку. Тара вяртаецца гаспадарам.

У 2009 годзе на базе прадпрыемства быў створаны рэгіянальны цэнтр па зборы зношаных шын.

З 2012-га жыхары горада і раёна маюць магчымасць здаць адпрацаваныя адходы, якія ўтрымліваюць ртуць: градуснікі, люмінісцэнтныя і энергазберагальныя лямпы, а таксама адпрацаваныя элементы спажывання — батарэйкі — у стацыянарныя пункты прыёму другаснай сыравіны, якія абсталяваныя спецыяльнымі кантэйнерамі.

У 2013 годзе ўведзена ў эксплуатацыю тэхналагічная лінія сартавання другасных матэрыялаў, дзе яны праходзяць дасартоўку па відзе і колеры. Другасную сыравіну прымаюць у трох стацыянарных прыёмных пунктах: у самім горадзе, гарадскім пасёлку Чырвоная Слабада і ў вёсцы Дубеі. Калі ў кагосьці няма такой магчымасці, то неабходна звязацца па тэлефоне (80174) 27-92-88 з нарыхтоўшчыкам, які забярэ яе машынай. Гэта можа быць папера, кардон, разнастайныя адходы пластыку, ПЭТ-бутэлькі, плёнка, тара і каністры ад мыйных сродкаў, адходы ліставога і бутэлечнага шкла, зношаныя шыны, буйная, сярэдняя, дробная габарытная бытавая тэхніка.



Пад'ехаў спецаўтатранспарт. Вялізны пакет смецця перамяшчаецца з-пад зямлі ў кантэйнер аўтамабіля.

Са жніўня 2018 года арганізаваны платны збор ад насельніцтва бытавой тэхнікі, якая выйшла з ужывання. Цяпер усе, хто жадае, могуць папоўніць сямейны бюджэт. За кожны кілаграм вагі ім выплачваецца па 25 капеек.

«ЭкаКомплекс» рэгулярна ладзіць акцыі па нарыхтоўцы другасных рэсурсаў сярод насельніцтва. Жыхары Салігорскага раёна актыўна ў іх удзельнічаюць. Каму ж зашкодзіць лішні рубель! Напрыклад, жыхарка пасёлка Чыжоўка ў красавіку здала ў перасоўны прыёмны пункт каля 300 кілаграмаў шкла і 50 кілаграмаў ПЭТ-бутэлек за адзін раз. І такіх сумленных людзей становіцца ўсё больш.

Абнаўленне кантэйнернага парка, закупка новай аўтатэхнікі, пераасnашчэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы, адкрыццё нарыхтоўчых пунктаў дазволіла значна павялічыць аб'ёмы збору, нарыхтоўкі другасных рэсурсаў. Калі ў 2011 годзе іх было сабрана і нарыхтавана 1600 тон, то ў 2017-м — 3600 тон. У планах — не спыняцца на дасягнутым, умацоўвацца, развівацца, удасканальвацца, паляпшаць вытворчыя паказчыкі. Напрыклад, у хуткім часе будзе закуплена аўтамашына «Газель» для мыцця кантэйнераў.



Вадзіцель спецаўтамашыны Сяргей КВАЧ і стропальшчык Фёдар САРАНЦАЎ з дапамогай пульта дыстанцыйнага кіравання пагружаюць смецце ў кантэйнер.

— Работа па ўкараненні раздзельнага збору адходаў — працаглы і карпатлівы працэс, які патрабуе зладжанай работы не адной структуры або арганізацыі, — адзначыў Валерый Ермаковіч. — Сваіх вынікаў мы дабіліся дзякуючы дапамозе Салігорскага райвыканкама, Салігорскай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, якая кантралюе асобны збор адходаў юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, санкцыянаванае захаванне адходаў, таксама — мясцовых сродкаў масавай інфармацыі і мясцовага тэлевізійнага канала, якія рэгулярна асвятляюць пытанні раздзельнага збору адходаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 690301806.

# ЗА ПАРУ КРОКАЎ АД «ЗАЛАТОЙ» ДАТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Студыя жывапісу для юнацтва і дарослых працуе пры ўстанове ўжо 49 гадоў. Яе нязменны кіраўнік Яўген Смунёў разам з іншымі ўдзельнікамі падрыхтавалі спецыяльную выстаўку, прысвечаную 60-годдзю роднага горада з назвай «Салігоршчына — куточак Беларусі». А вось заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца «Сузор'е» пад кіраўніцтвам Вадзіма Матанцава прывёз каштоўны падарунак да юбілею ажно з Балгарыі. На трэцім міжнародным фестывалі-конкурсе «Славянскі вянок» салігарчане ўзялі дзевяць першых месцаў! «Юбілейнай» дзясятай стала ўзнагарода самога кіраўніка Вадзіма Пятровіча — пісьмо падзякі «За гарманічнае ўвасабленне ідэй на сцэне. Найлепшаму рэжысёру-пастаноўшчыку».

Акрамя творчага напаўнення, салігорскі Палац культуры папрыгажэе і вонкава. У будынка адрамантуюць фасад, а на пляцоўцы побач з'явіліся каваныя лавачкі для адпачынку. Яшчэ адзін штрых — пад вялізнай елкай «прыпыніцца» скрыпач з кветкамі ў кішэнях. Вобраз будучай металічнай скульптуры таксама распрацоўвалі мясцовыя мастакі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Фінал гарадскога фестывалю творчасці «Салігорск — гэта ты».**


**ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 13 сентября 2018 года на 15-м открытом аукционе проводит 13-й от 16 августа 2018 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
